133. МОСКВА 19. УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИНСТИТУТ СОВ. СТРОИТЕЛЬСТВА И ПРАВА 1. 1.12.36 ЗВЯЗ.2.

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 80 (5454) СЕРАДА 8 КРАСАВІКА 1936 г. Год выдання XIX

ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР — АБ ПЛАНЕ АРГАНІЗАЦЫІ РАЗВОЗНАГА ГАНДЛЮ НА ЧАС ВЕСНАВОЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ 1936 года
ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — ЯШЧЭ РАЗ ПРА АБМЕН ПАРТЫЙНЫХ ДАКУМЕНТАЎ.
ПРАФ. Н. ДАРОЖКІН — ТРОХТЫСЯЧНІКІ
АГЛЯД ДРУКУ — КАЛГАСНІКІ ЗДАЮЦЬ АГРАТЭХЭКЗАМЕН
НАРЫС: П. ШАСТАКОЎ — КАМАНДЗІРЫ ЗЯМЛІ
ЗА РУБЯЖОМ:
СПРЭЧКІ Ў ПАЛАЦЕ АБШЧЫН АБ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫЦЫ АНГЛІІ
ФРАНЦУЗСКІ ПРАЕКТ ЕЎРАПЕЙСКАГА ПАКТУ
ЯПОНА-ГЕРМАНСКІ ДАГАВОР АБ УЗАЕМНАЙ ДАПАМОЗЕ
АНТЫВАЕННАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ Ў ВЕРДЭНЕ

Яшчэ раз пра абмен партыйных дакументаў

У КП(б) Беларусі разгарнулася работа па абмену партыйных дакументаў. Ужо некалькі тысяч комуністаў прайшлі абмен партыйных дакументаў і атрымалі новыя партыйныя білеты.

Цяпер ужо можна падвесці некаторыя вынікі ходу абмену партыйных дакументаў, гэтага важнейшага палітычнага мерапрыемства, праводзімага нашай партыяй.

Абмен партыйных дакументаў увогуле ў КП(б)Б праходзіць на высокім прынцыповым палітычным узроўні, у адпаведнасці з рашэннямі снежаньскага пленума ЦК ВКП(б).

Высокае званне члена ленінска-сталінскай партыі можа насіць толькі той, хто беззаветна адданы справе **Леніна—Сталіна,** справе комунізма.

Комуніст — гэта ініцыятыўны, ідэйна-ўзброены, бясстрашны, непрымірымы да ворагаў і да канца адданы справе **Леніна—Сталіна** баец партыі.

І гэта высокае і пачэснае званне члена партыі можа насіць не ўсякі. Вялікі правадыр і настаўнік нашай партыі таварыш **Сталін** вучыць нас таму, што «Мы, комуністы, — людзі асобага складу. Мы скроены з асобага матэрыялу. Мы — тыя, якія складаем армію вялікага пролетарскага стратэга, армію таварыша Леніна. Няма нічога вышэй, як гонар належаць да гэтай арміі. Няма нічога вышэй, як званне члена партыі, аснавальнікам і кіраўніком якой з'яўляецца таварыш Ленін. Не ўсякаму дана быць членам такой партыі. Не ўсякаму дана вытрымаць няўзгоды і буры, звязаныя з членствам у такой партыі. Сыны рабочага класа, сыны нужды і барацьбы, сыны неймаверных лішэнняў і гераічных намаганняў — вось хто, перш за ўсё, павінны быць членамі такой партыі».

Абмен партыйных дакументаў замацоўвае велізарнейшую палітычную работу, праведзеную нашай партыяй, — праверку партыйных дакументаў.

Першыя вынікі ходу абмену партыйных дакументаў у КП(б) Беларусі гавораць за тое, што не ўсе партыйныя арганізацыі па-большэвіцку падрыхтаваліся да гэтага важнейшага мерапрыемства партыі. Ёсць асобныя факты, калі абмен партыйных дакументаў у некаторых партыйных арганізацыях разглядалі як тэхнічную работу.

ЦК КП(б)Б адтэрмінаваў пачатак абмену партыйных дакументаў па крупскай партыйнай арганізацыі, сур'ёзна папярэдзіўшы кіраўнікоў райкома, што яны нясуць персанальную адказнасць за правільнасць правядзення абмену партыйных дакументаў.

Сакратар ЦК тав. **Гікало** ў спецыяльнай тэлеграме папярэдзіў сакратара асвейскага райкома, што ён не выканаў указання ЦК аб дасканалай і ўсебаковай падрыхтоўцы да абмену партыйных дакументаў і што ЦК вымушаны будзе адтэрмінаваць абмен партыйных дакументаў па асвейскай партарганізацыі, калі райком на хаду не выправіць дапушчаных памылак.

Гэтыя папярэджанні адносяцца да ўсіх партыйных арганізацый. **ЦК патрабуе чоткага і безагаворачнага выканання рашэнняў снежаньскага пленума ЦК ВКП(б).**

У некаторых партыйных арганізацыях, як, напрыклад, у клімавіцкай і лёзнянскай, замест дзелавой палітычнай работы ёсць факты парадпасці, шуміхі пры абмене партыйных дакументаў. Сакратар Клімавіцкага райкома партыі Анісаў на раённай нарадзе партыйнага актыва, дзе прысутнічалі і беспартыйныя, урачыста, пад апладысменты ўсёй залы паведаміў, каму ён выдаў першы партыйны білет.

У Лёзнянскім раёне пайшлі яшчэ далей. Чаго варты такі пункт пастановы бюро райкома: «Бюро РК КП(б)Б адзначае, што тав. Стэфкін па-ранейшаму непартыйна адносіцца да пісем рабселькораў. Гэта будзе ўлічана пры абмене партдакументаў тав. Стэфкіна».

Аказваецца, такога роду пастановы — не адзінкавы. Тут райком партыі дапусціў яўную памылку. Замест таго, каб па-большэвіцку разабрацца ў недахопах таго ці іншага комуніста, дапамагчы яму знішчыць памылкі, райком стаў на шлях запужвання комуністаў, чым па-сутнасці сказіў палітычную сутнасць абмену партыйных дакументаў.

Аб няведанні комуністаў лёзнянскім райкомам сведчыць і такі факт, калі толькі ў момант абмену партыйных дакументаў райком даведваецца, што кандыдат партыі Казлоў не плаціў 20 месяцаў членскіх узносаў.

Райком партыі не вывучыў усебакова да абмену партыйных дакументаў становішча партыйнай работы ў пярвічнай партарганізацыі. Падобнага-ж роду факты, калі толькі пасля выкліку ў райком на абмен партыйных дакументаў сакратар райкома пераконваецца аб непадрыхтаванасці партыйнай арганізацыі да абмену, ёсць у некаторых іншых арганізацыях (Віцебск, Мазыр).

Трэба лепш і глыбей вывучаць усё становішча партыйна-масавай і палітыка-выхаваўчай работы да выкліку партыйнай арганізацыі ў райком.

Толькі неразуменнем палітычнай сутнасці абмену партыйных дакументаў можна вытлумачыць такія факты, што ў некаторых раёнах замест усебаковага глыбокага вывучэння кожнага члена партыі галоўны ўпор зрабілі на праверку палітычных ведаў. І вельмі часта пры няправільных адказах члена партыі не растлумачваюць яму яго памылак, а стараюцца яшчэ больш заблытаць яго.

Хіба не ясна, што абмен партыйных дакументаў — гэта не праверка ведаў комуніста, а глыбокае, усебаковае вывучэнне яго, наколькі ён апраўдвае высокае званне члена партыі. Зразумела, правяраць веды комуністаў патрэбна, але нельга ператвараць абмен у экзамены.

Яшчэ і яшчэ раз патрэбна падкрэсліць неабходнасць павышэння большэвіцкай пільнасці ўсіх партыйных арганізацый. Усякае самасупакаенне, апартуністычная благадушнасць наносяць велізарнейшую шкоду, не даюць магчымасці да канца выкрыць і выгнаць з партыі прытаіўшыхся сям-там класавых ворагаў. Для нас, працуючых на граніцы з капіталістычным Захадам, задача павышэння большэвіцкай пільнасці выключна вялікая.

У Магілёве ў радзе пярвічных партыйных арганізацый пасля праверкі партыйных дакументаў ужо ўскрыты і выкрыты яўныя ворагі партыі — трацкісты, белагвардзейцы і іншая нечысць. Падобныя факты маюць месца і ў іншых партыйных арганізацыях (Барысаў, Гомель, Слуцк).

Вызваляючы партыю ад пасіўных, не апраўдваючых высокага звання члена партыі, партыйныя арганізацыі, сакратары райкомаў павінны ні на мінуту не аслабляць, а наадварот — павышаць большэвіцкую пільнасць.

ЦК ВКП(б) не раз указваў на неабходнасць наладжвання самага ідэальнага парадку ў партыйнай гаспадарцы. Аднак, да гэтага часу ёсць факты, калі справа ўліку комуністаў, афармлення ўчотных партыйных дакументаў пры пераездах членаў партыі пастаўлена яшчэ далёка не здавальняюча. Нават у менскай — сталічнай партарганізацыі ёсць рад фактаў, калі пасля пераездаў па тры месяцы не высылаюцца партыйныя дакументы, і члены партыі вымушаны па віне паасобных работнікаў месяцамі адрывацца ад партыйнага жыцця і не могуць прайсці абмену партыйных дакументаў.

Менск — не выключэнне. Зусім нядаўна мы паведамлялі аб грубейшым парушэнні ўстаноўленых правіл афармлення ўчотных партыйных дакументаў і з боку іншых партыйных арганізацый (Буда-Кашалеў, Віцебск і інш.).

Наладзіць партыйны ўчот, навесці ўзорны парадак у партыйнай гаспадарцы — важнейшая задача партыйных арганізацый.

Абмен партыйных дакументаў — важнейшая гістарычная падзея ў жыцці ўсёй партыі і кожнага комуніста. Партыя давярае партыйны білет толькі таму, хто з'яўляецца да канца беззаветна адданым справе партыі, справе **Леніна—Сталіна.**

Насіць партыйны дакумент, састаяць у партыі **Леніна—Сталіна**— гэта вялікі гонар. Партыйны білет — гэта дакумент, які паказвае прыналежнасць да нашай слаўнай большэвіцкай партыі.

Трэба канстатаваць факты абураючых адносін да хавання партыйных дакументаў з боку асобных членаў партыі. У Бялынічах на другі дзень пасля атрымання новага партыйнага білета член партыі Сініцкі згубіў яго. Гэты факт выключна абураючага парадку сведчыць аб страце класавай пільнасці, апартуністычным ратазействе і т. д. Гэты факт павінен прымусіць усе партыйныя арганізацыі і кожнага комуніста ў паасобку зрабіць для сябе большэвіцкія вывады.

Ахова партыйнага білета — пярвейшы абавязак комуніста. Трэба памятаць, што асколкі разбітага класавага ворага ўсімі сіламі будуць імкнуцца і зараз імкнуцца выкарыстаць ратазейства асобных комуністаў, каб жульніцкім шляхам заўладаць партыйным білетам. Той, хто гэтага не разумее, той наносіць шкоду нашай партыі і дапамагае класаваму ворагу.

Абмен партыйных дакументаў яшчэ больш згуртуе ўсю КП(б)Б вакол сталінскага Цэнтральнага Камітэта і вялікага **Сталіна,** яшчэ больш сцэментуе рады большэвіцкай партыі.

Выканаўчы Камітэт Комуністычнага Інтэрнацыянала з глыбокім жалем паведамляе аб смерці адважнага і самаадданага барацьбіта за справу рабочага класа, старэйшага дзеяча германскага і міжнароднага рабочага руху, аднаго з аснавальнікаў комуністычнай партыі Германіі, члена палітбюро ЦК КПГ і члена Выканкома Комуністычнага Інтэрнацыянала.

тав. ФРЫЦА ГЕКЕРТА

СПРЭЧКІ Ў ПАЛАЦЕ АБШЧЫН АБ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫЦЫ АНГЛІІ

ЛОНДАН, 7 красавіка. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, у сувязі з паражэннем урада пры галасаванні рэзалюцыі лейбарысткі Елены Вількінсон (адносна ўстанаўлення аднолькавых з мужчынамі ставак аплаты працы жанчын — служачых грамадзянскіх ведамстваў) прэм'ер-міністр Балдуін учора паставіў у палаце абшчын пытанне аб давер'і, унёсшы рэзалюцыю працэдурнага характару (у спрэчках па такой рэзалюцыі могуць абмяркоўвацца любыя пытанні).

Уінстон Чэрчыль, гаворачы пра становішча ў Абісініі, заявіў, што ў некаторых аўтарытэтных колах сумняваюцца ў здольнасці Абісініі прадаўжаць супраціўленне нават да перыяду дажджоў.

— Калі гэта так, — прадаўжаў Чэрчыль, — то амаль усе абісінцы, якія не знішчаны атрутнымі матэрыямі, могуць быць паднявольны, і іх радзіма захвачана Італіяй. Калі гэта здарыцца, гэта будзе найбольш сумная глава ў сучаснай гісторыі Англіі. Як указаў Чэрчыль, Англія нічога не зрабіла для Абісініі.

З другога боку, Англія выклікала найвялікшую варожасць да сябе з боку Італіі, што ў будучым значна ўскладніць задачы англійскіх узброеных сіл. Затым Чэрчыль заявіў, што Англія падбухторыла Францыю ўступіць на шлях, які не прынёс Абісініі дастатковай дапамогі, але выклікаў адчужэнне паміж Францыяй і Італіяй. Гэта скарыстала Германія, каб разарваць дагаворы і заняць Рэйнскую зону. Чэрчыль падкрэсліў, што англійскі ўрад не можа ўнікнуць адказнасці за гэта.

Гаворачы пра каланіяльнае пытанне, Чэрчыль задаў запытанне, якія адносіны Англіі да звароту калоній Германіі.

— Я не сумняваюся, — сказаў далей Чэрчыль, — што ўся германская граніца, якая праходзіць каля французскай тэрыторыі, будзе як мага шпаркімі тэмпамі ўмацавана. Праз тры, чатыры, ці шэсць месяцаў там узнікне грандыёзны бар'ер, які дасць магчымасць Германіі накіраваць велізарныя сілы ў бок Бельгіі і Галандыі. Гэта — найвялікшая небяспека для Англіі.

Затым выступіў міністр замежных спраў Ідэн. Абгрунтоўваючы пазіцыю Англіі ў італа-абісінскім канфлікце, Ідэн указаў, што пасля згоды Італіі і Абісініі пайсці на прымірэнне, італьянскі ўрад узмацніў агрэсію. **Англійскі ўрад лічыць нецярпімым, — гаварыў далей Ідэн, — каб у Жэневе вяліся размовы аб прымірэнні і каб у той-жа час вайна прадаўжалася. Або павінна быць сапраўднае прымірэнне, якое выражаецца на даны перыяд у спыненні варожых дзеянняў, або «камітэту восемнаццаці» прыдзецца зноў абмяркаваць свае задачы.**

Гаворачы аб становішчы, створаным германскім адказам, Ідэн закрануў мяркуемую нараду лакарнскіх дзяржаў. Англійскі ўрад, заявіў ён, не лічыць, што спробы да прымірэння пацярпелі крах, абмен думак можа прынесці карысць. Ідэн згодзен з тым, што пры першай магчымасці ў абмеркаванне павінна быць уцягнута Ліга нацый у цэлым, паколькі прапановы Гітлера змяшчаюць пытанні, датычныя іншых краін, паміма заходніх дзяржаў. Англійскі ўрад па-ранейшаму гатоў прымаць удзел разам з іншымі краінамі ў эканамічных і фінансавых мерах, калі іншыя краіны згодзяцца з гэтым і будуць выконваць іх так, як і Англія.

Остын Чэмберлен у сваёй прамове заявіў, што ўрокі абісінскай вайны і дзеянні Лігі нацый у італа-абісінскім канфлікце вымушаюць паставіць пытанне, ці жадае Англія ператварыць калектыўную безапаснасць у рэальнасць. Кожная краіна павінна адказаць на пытанне, ці хоча яна **прадаставіць усе свае ваенныя рэсурсы ў** распараджэнне Савета Лігі, калі агрэсія ўстаноўлена Лігай.

Паводле слоў Чэмберлена, Англія «крыху занадта моцна» імкнецца пачаць перагаворы з Германіяй. Калі будзе заключаны новы дагавор, — прадаўжае ён, — мы павінны мець гарантыі, што ён будзе выконвацца, і павінны ведаць, якія санкцыі будуць прымянены, калі ён будзе разарваны.

Унесеная ўрадам рэзалюцыя была адобрана большасцю 361 голасу супроць 145.

ЧЫГУНАЧНІЦА-ОРДЭНАНОСЕЦ

Вілетнікава Елена Паўлаўна, дыспетчэр Гомельскага аддзялення службы эксплаатацыі, узнагароджаная ордэнам Працоўнага чырвонага сцяга.

ФРАНЦУЗСКІ ПРАЕКТ ЕЎРАПЕЙСКАГА ПАКТУ

ПАРЫЖ, 7 красавіка. (БЕЛТА). У афіцыяльным паведамленні аб учарайшым пасяджэнні савета міністраў адзначаецца, што адобраны саветам канчатковы тэкст адказу Францыі на германскі мемарандум складаецца з двух самастойных частак.

1. **Адказ на германскія абвінавачанні,** у якім, між іншым, канстатуецца, што Германія, заняўшы Рэйнскую зону, адмаўляецца даць узамен якую-б там ні было новую гарантыю безапаснасці.

2. **«Канструкцыйны план дзеянняў для арганізацыі міру».** Ён прадстаўляе сабой у сутнасці праект агульнаеўрапейскага пагаднення аб узаемнай дапамозе.

Друк асабліва падкрэслівае, што праектуемая французамі сістэма ўзаемнай дапамогі пашыраецца таксама на Савецкі Саюз.

— Сістэма ўзаемнай дапамогі, прадугледжваемая французскім урадам, — указвае газета «Пці пары'зен», — ахватвае зусім натуральна Савецкі Саюз, **які стаў, як вядома, адным з найбольш верных і паслядоўных членаў Лігі нацый.** Газета «Энр» адзначае, што, у процілегласць Гітлеру, Францыя цалкам грунтуе свой план міру на **сістэме еўрапейскай калектыўнай** безапаснасці, «адной з лепшых асноў якой з'яўляецца СССР».

Япона-германскі дагавор аб узаемнай дапамозе

ЛОНДАН, 6 красавіка. (БЕЛТА). Як паведамляе газета «Дэйлі тэлеграф», германа-японскі дагавор аб **узаемнай дапамозе,** які адрозніваецца вельмі мала ад звычайнага дагавору аб ваенным саюзе, будзе падпісаны ў бліжэйшым часе. Перагаворы аб гэтым вяліся на працягу многіх месяцаў, і германскі ўрад хоча, каб дагавор быў падпісаны неадкладна.

Нядоўгавечная дружба

ГЕРМАНСКІЯ ІНТРЫГІ Ў ПОЛЬШЧЫ

ЛОНДАН, 7 красавіка. (БЕЛТА). Паводле слоў газеты «Манчэстэр гардыен», не гледзячы на прыязныя адносіны паміж Германіяй і Польшчай, рух сярод германскага насельніцтва за злучэнне з Германіяй адбываецца не толькі ў Данцыгу, але і ў Польшчы. Паводле слоў газеты, у польскай Верхняй Сілезіі было арыштавана 200 немцаў — удзельнікаў германскай арганізацыі, якая ставіць сваёй мэтай злучэнне польскай Верхняй Сілезіі з Германіяй. 400 членам арганізацыі ўдалося ўцячы ў Германію.

Газета падкрэслівае, што ў сучасны момант Германія не хоча прадпрымаць дзеянняў, якія пашкодзілі-б польска-германскім адносінам. Аднак, — піша яна, — прыдзе час, калі Германія будзе трэбаваць рашучага перагляду сваіх усходніх граніц. Гэта пазіцыя Германіі, — заключае газета, — паказвае, якія хісткія асновы цяперашняй германа-польскай дружбы.

Пратэст Малой Антанты

ВЕНА, 7 красавіка. (БЕЛТА). У нотах пратэсту дзяржаў Малой Антанты—Чэхаславакіі, Румыніі і Югаславіі супроць увядзення ўсеагульнай вайсковай павіннасці ў Аўстрыі ўрады ўказаных трох краін пакідаюць за сабой права выказацца аб мерах, якія яны палічаць патрэбным прыняць для абароны сваіх інтарэсаў.

Афіцыяльна паведамляецца, што аўстрыйскі ўрад не мае намеру рэагаваць на гэты сумесны крок Чэхаславакіі, Румыніі і Югаславіі.

З ФРОНТА КЛАСАВАЙ БАРАЦЬБЫ



СУТЫЧКА ДЭМАНСТРАНТАЎ З ПАЛІЦЫЯЙ У НЬЮ-ЁРКУ.
У Нью-Ёрку адбылася 12-тысячная дэманстрацыя беспрацоўных, занятых на грамадскіх работах, у часе якой адбылася сутычка з атрадам у 400 паліцэйскіх, якія прабавалі разагнаць дэманстрантаў. НА ЗДЫМКУ — сутыкненне дэманстрантаў з паліцэйскімі. На пярэднім плане дэманстрант, збіты з ног ударам паліцэйскай дубінкі.

Саюзфото.

Перад выбарамі ў французскі парламент

КАНДЫДАТЫ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ

ПАРЫЖ, 7 красавіка. (БЕЛТА). 26 красавіка — выбары ў французскі парламент. Компартыя апублікавала спіс сваіх кандыдатаў, якія будуць выстаўлены ў 608 участках. У ліку кандыдатаў віднейшыя кіраўнікі і работнікі компартыі — Марыс Тарэз, Жак Дзюкло, Марці, Манмусо, Вайян Кутур'е, Жытон, Мідоль, Перы і іншыя. Асноўныя лозунгі компартыі заклікаюць да барацьбы супроць фашызма, вайны і голечы.

АНТЫВАЕННАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ У ВЕРДЭНЕ

ПАРЫЖ, 6 красавіка. (БЕЛТА). У Вердэне адбылася шасцітысячная дэманстрацыя ў абарону міру, арганізаваная рэволюцыйнай асацыяцыяй былых франтавікоў. На грузавіках працоўныя Парыжа прыбылі ў Вердэн, дзе адбываліся кровапралітныя баі ў часе імперыялістычнай вайны. На ўсім шляху ад Парыжа да Вердэна насустрач дэманстрацыі выходзілі натоўпы народаў і віталі дэманстрантаў.

Сярод дэманстрантаў былі прадстаўнікі компартыі — Жак Дюкло і Вайян Кутур'е, прадстаўнік асацыяцыі рэспубліканскіх афіцэраў запасу і іншыя.

ВАЙНА У АБІСІНІІ

Наступленне італьянскіх войск

РЫМ, 6 красавіка. (БЕЛТА). У данясенні маршала Бадольо гаворыцца, што італьянскія войскі прадаўжаюць наступленне. Першы корпус італьянскай арміі, а таксама туземны корпус, прайшоўшы раён возера Ашангі, занялі Карам. Учора італьянскія войскі дасягнулі Алоамата — за 15 кілометраў на поўдзень ад Карам па дарозе, якая вядзе ў Дэсіе. У заходнім сектары паўночнага фронта адна з італьянскіх калон дасягнула раёна паміж рэкамі Ангарэб і Гандуя.

ГУТАРКА тав. ШТЭЙНА З МУСАЛІНІ

РЫМ, 7 красавіка. (БЕЛТА). Паўпрэд СССР Штэйн наведаў учора кіраўніка італьянскага ўрада Мусаліні, з якім меў доўгую гутарку.

ПЕРАМОГА ВУГЛЯКОПАЎ УЭЛЬСА

ЛОНДАН, 6 красавіка. (БЕЛТА). Барацьба 20 тысяч вуглякопаў у Уэльсе (Англія) закончылася перамогай. Уласнікі вугольных капальняў 4 красавіка заявілі аб сваёй згодзе задаволіць патрабаванні рабочых аб прызнанні калдагавору, устанаўленні мінімуму зарплаты і інш. патрабаванні.

Забастоўка павінна была пачацца сёння, але была адменена ў рэзультаце задавалення патрабаванняў вуглякопаў.

Ордэнаносцы-чыгуначнікі Заходняй дарогі

Сярод чыгуначнікаў Заходняй дарогі, узнагароджаных ордэнамі Саюза ССР, узнагароджаны наступныя стаханаўцы — чыгуначнікі БССР (спіс узнагароджаных па МББ дарозе надрукаван у мінулым нумары «Звязды»).

ОРДЭНАМ ЛЕНІНА:

1. **Байкачоў Леонці Фацеевіч**—машыніст паравознага дэпо Жлобін.

ОРДЭНАМІ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА:

1. **Вілетнікава Елена Паўлаўна** — дыспетчэр гомельскага аддзялення службы эксплаатацыі.
2. **Грушэцкі Альберт Іванавіч**—машыніст паравознага дэпо Магілёў.

ОРДЭНАМІ «ЗНАК ПОЧЕТА»:

1. **Лазебнікаў Цімафей Паўлавіч** — саставіцель паяздоў станцыі Жлобін.
2. **Нікіцін Александр Іванавіч**—машыніст паравознага дэпо Гомель.

За пагрузку 100 тысяч вагонаў у суткі

ЖЛОБІН, 7 красавіка. Па ўсіх станцыях жлобінскага аддзялення эксплаатацыі адбыліся мітынгі, прысвечаныя ўзнагароджанню лепшых людзей чыгункі ордэнамі Саюза ССР. Мітынгі прайшлі пад лозунгам — выканаць данае абяцанне Сталіну — грузіць 100 тысяч вагонаў у суткі, зрабіць аддзяленне эксплаатацыі стаханаўскім.

— Мы ганарымся, — пішуць у сваёй рэзалюцыі рабочыя дэпо Жлобін, — што ў ліку ўзнагароджаных ёсць машыніст-крываносавец нашага дэпо т. **Байкачоў** і саставіцель паяздоў станцыі Жлобін тав. **Лазебнікаў.** Абавязваемся да 1 мая ператварыць дэпо ў стаханаўскае, зрабіць яго лепшым на Заходняй чыгунцы і дабіцца права на рапарт любімаму правадыру народаў таварышу **Сталіну** і жалезнаму наркому тав. **Кагановічу.**

(БЕЛТА).

Працаваць яшчэ лепш

ВІЦЕБСК, 7 красавіка. З вялікім уздымам сустрэлі рабочыя віцебскага паравознага дэпо паведамленне аб узнагароджанні лепшых людзей транспарту ордэнамі Саюза ССР.

Гэта вестка тым больш радасная, што сярод узнагароджаных самай высокай узнагародай—ордэнам Леніна—машыніст віцебскага дэпо тав. **Зіновіч,** ордэнамі Працоўнага чырвонага сцяга — начальнік паравознага дэпо тав. **Егораў** і токар дэпо тав. **Казлоў.**

Тав. Зіновіч адзін з ініцыятараў крываносаўскага руху сярод машыністаў віцебскага дэпо. На сваім паравозе ён паказаў найвышэйшыя хуткасці безаварыйнага вядзення цяжкаважкіх паяздоў (пры норме 1.750 тон вёў паязды ў 2.600 тон, нагнаўшы пры гэтым у дарозе да 30 мінут).

Тав. Казлоў — комсамолец, выконвае нормы на 500 проц., а ў асобныя дні і да 1.000 проц. Якасць работы — выдатная.

Дэпо пад кіраўніцтвам начальніка т. Егорава дабілася значнага паляпшэння работы — паменшыўся парк хворых паравозаў, палепшылася якасць рамонту, паскорыўся абарот паравозаў.

Рабочыя ў сваіх выступленнях на мітынгах абавязаліся несупакойвацца на дасягнутым, змагацца за яшчэ лепшыя паказальнікі работы дэпо, звярнуўшы асаблівую ўвагу на ліквідацыю аварый і крушэнняў.

Першыя 7550 гектараў пасеваў яравых

На Поўдні Совецкай Беларусі разгортваецца сяўба. Першыя палявыя работы пачаліся ў 42 раёнах.

Найбольшы процант выканання палявых работ мае Мазыршчына. Да 5 красавіка па калгасах Мазыршчыны ўзарана 3.129 гектараў, пераворана 847 гектараў і забаранавана зябліва 744 гектары. У Брагінскім раёне ўзарана 2.204 гектары, пераворана 1.204 і забаранавана 2.017 гектараў.

Усяго па 42 раёнах, распачаўшых палявыя работы, узарана 36.123 гектары, пераворана—12.549 і забаранавана 12.028.

Да 5 красавіка па калгасах 16 раёнаў паўднёвай зоны БССР засеяна 7.550 гектараў яравога кліну. Пасеяна: пшаніцы 1.026 гектараў, ячменю—1.074, аўса—4.646, яравога жыта — 280, бабовых — 40, лубіну—30, насеннай вікі — 56, лугавых траў — 47, аднагадовых траў—25, ільну — 115 гектараў, 3 гектары гародніны і кармовых буракоў. Гэта складае 0,3 проц. усяго плана сяўбы па БССР. У мінулым годзе на гэты-ж час было пасеяна 0,1 проц. Найбольш пасеяна яравых у Ельскім раёне — 1.495 гектараў, або 9,3 проц. і ў Капаткевіцкім — 1.300 гектараў.

Разгортваюцца палявыя работы і ў раёнах сярэдняй зоны БССР. У Рэчыцкім, Кіраўскім і Прапойскім раёнах пасеялі першыя гектары пшаніцы, аўса, ячменю і яравога жыта.

АБ ЗДАЧЫ СПРАЎ САКРАТАРАМІ РАЙКОМАЎ

ЦК КП(б)Беларусі прыняў цікавае рашэнне (ад 24 лютага 1936 г.), у якім устанавіў парадак здачы спраў сакратарамі гаркомаў і райкомаў пры перамяшчэнні і вызваленні іх ад работы і перадачы абавязкаў новым сакратарам. У гэтым рашэнні ЦК партыі Беларусі ўказана:

«1. Пры выбранні новага ранейшы сакратар гаркома, райкома КП(б) Беларусі робіць справаздачу на бюро або пленуме аб становішчы партыйнай гаспадаркі ў прысутнасці новага сакратара і прадстаўніка ЦК або акругкома.

2. Пасля справаздачы ранейшага сакратара гаркома, райкома аб рабоце і выбрання новага сакратара новы сакратар сумесна з ранейшым сакратаром у прысутнасці старшыні рэвізійнай камісіі складаюць акт аб прыёме і здачы спраў.

3. Перадачы па акту належаць: сакрэтныя справы (з перапіскай ГК і РК), уліковыя дакументы комуністаў, якія ёсць у гаркоме, райкоме, партыйныя білеты і кандыдацкія карткі, грашовыя сродкі, пячатка і ўсе архівы.

4. Пасля прыёму і здачы спраў і подпісу сакратарамі гаркомаў і райкомаў прыёма-здатачнага акту апошні прадстаўляецца на зацвярджэнне бюро ГК, РК і толькі пасля рашэння бюро аб зацвярджэнні прыёма-здатачнага акта здача і прыём спраў лічацца закончанымі.

5. Акты аб прыёме і здачы спраў складаюцца ў двух экземплярах, з якіх адзін пасля зацвярджэння бюро гаркома і райкома застаецца ў справах, а другі накіроўваецца ў ЦК КП(б) Беларусі.

6. У райкомах, якія ўваходзяць у акругі, прыёма-здатачныя акты павінны быць складзены ў трох экземплярах, з якіх адзін застаецца ў справах райкома, другі накіроўваецца ў акругком і трэці — у ЦК КП(б) Беларусі».

Гэта рашэнне ЦК КП(б) Беларусі мае, несумненна, станоўчае значэнне. Бліжэйшы вопыт і прымяненне на практыцы гэтага рашэння пакажуць, наколькі яно спрыяе сапраўднаму павышэнню адказнасці за становішча і далейшае ўпарадкаванне партыйнай гаспадаркі не толькі сакратара гаркома або райкома, але і бюро ў цэлым, паколькі прыёма-здатачны акт павінен быць абмяркован і зацверджан на пасяджэнні бюро гаркома ці райкома.

Выкананне па сутнасці, а не фармальна гэтага парадку, устаноўленага рашэннем ЦК КП(б) Беларусі можа спрыяць ліквідацыі пашыранай ва многіх раёнах шкоднай «сістэмы», калі стары сакратар зусім не лічыў патрэбным, або наспех спадміў новага сакратара з усімі справамі і вымадкаў, прадастаўляючы новаму работніку разбірацца і адказваць за атрыманую «спадчыну» ў партыйнай гаспадарцы.

Імення таму трэба забяспечыць, каб справаздача старога сакратара РК на бюро або пленуме райкома датычылася ўсёй партыйнай гаспадаркі райпартарганізацыі і не зводзілася толькі да фармальнай справаздачы па прыёма-здатачнаму акту. Справаздача старога сакратара павінна дапамагчы новаму сакратару райкома (або гаркома) правільна арыентавацца ў становішчы ўсёй райпартарганізацыі і яе пярвічных звенняў, у стане партыйнага ўліку, у руху комуністаў у арганізацыі, у статыстыцы, архівах, фінансах, — словам, ва ўсёй партыйнай гаспадарцы гаркома або райкома.

Зараз, калі адбываецца абмен партдакументаў і па-новаму арганізуецца ўся работа па дакладнаму і правільнаму ўліку членаў і кандыдатаў партыі, рашэнне ЦК Беларусі, якое ўстанаўлівае парадак перадачы спраў і павышае адказнасць за партыйную гаспадарку і ў першую галаву за партыйныя дакументы, якія захоўваюцца ў райкомах і гаркомах, з'яўляецца надзвычай важным. Практыка работы мясцовых беларускіх партарганізацый пакажа, наколькі метазгодна і паспяхова будзе рэалізован гэты, у асноўным станоўчы пачын і каштоўнае мерапрыемства.

(З журнала «Партийное строительство»).

ЗА ВЯЛІКУЮ СОВЕЦКУЮ ОПЕРУ

Два дні цягнулася дыскусія ў Беларускім дзяржаўным тэатры оперы і балета па пытаннях, узнятых у артыкулах «Праўды».

Уключыўшыся пазней за ўсіх у абгаварэнне ўзнятых «Праўдой» пытанняў, работнікі тэатра ажыўлена і актыўна абгаварылі сучаснае становішча тэатра, яго прадукцыю, яго творчы твар.

Але дыскусія не прайшла на адным узроўні. Яна праходзіла нейкімі хвалямі. Пачаўшыся з давяльнага і сур'ёзнага абгаварэння работы тэатра, яна момантамі спускалася ўніз, да дробязей, да плётак, да ўзаемных крыўд, да капеечных пытанняў.

А ад тэатра оперы і балета мы ўправе чакаць многага.

За свае пяцігадовае існаванне тэатр паставіў рад оперных спектакляў, па-рознаму ўспрымаючы і трактуючы сутнасць твораў і іх эпоху. Не абышлося і без фармалістычных, натуралістычных памылак.

Цяпер тэатр стаіць перад адной складанай і адказнай задачай. Ён павінен стварыць совецкую оперу, якая адлюстроўвала-б як нашу сучасную тэматыку, так і мінулае беларускага народу.

Умовы для стварэння такой оперы ў наяўнасці. Па-першае, гэта багатая наша соцыялістычная рачаіснасць, якая прадстаўляе сабой выключна шырокі і ўдзячны матэрыял для майстра. Па-другое, гэта багатая народная творчасць, фальклор, здольны пры ўмелым выкарыстанні зрабіць оперу рэалістычнай, глыбока насычанай, сапраўды народнай. Па-трэцяе, гэта кадры выканаўцаў, якія растуць як у тэатры, так і па-за тэатрам і пры адпаведным кіраўніцтве могуць стварыць выдатныя вобразы, выдатныя творы ў цэлым.

Не адмаўляючыся ад класічных твораў мінулага, наадварот, умела, правільна ўспрымаючы іх, мы адначасова павінны стварыць арыгінальную беларускую оперу. І тут паўстае пытанне: наколькі тэатр пры сучасным яго становішчы здолен выканаць задачы, якія перад ім стаяць, прычым выканаць добра, гэта значыць стварыць высока мастацкі оперны спектакль?

Адказ на гэта пытанне дала творчая дыскусія ў тэатры.

Перш за ўсё трэба адзначыць той факт, што ў тэатры няма здаровай творчай абстаноўкі. Кіраўніцтва тэатра не здолела згуртаваць усіх работнікаў тэатра ў адзіны творчы калектыў, для якога послех усяго тэатра і кожнага актора ў паасобку ёсць кроўная справа кожнага.

Кампазітар Туранкоў з законным абурэннем расказваў аб тым, з якой роўнадушнасцю аднесліся многія работнікі тэатра да падрыхтоўкі оперы «На купаллі». Многія рапылі так: лібрэто напісаў Чарот — добра, музыку піша Туранкоў — добра, паставіць оперу ўзяўся рэжысер Барысевіч — таксама добра. Хай яны як могуць так і робяць... Прычым тут мы?

Шкодная групоўшчына разлагаюча адбіваецца на арганізме тэатра, адцягвае яго сілы на вырашэнне склочных сварак, пазбаўляе яго адзінага творчага твару.

Вывад можна зрабіць такі, што ў тэатры не ўсё ў парадку. Вялікі здольны калектыў распылен, не працуе, не вучыцца. І натуральна, што пры такім становішчы тэатр не справіцца з пастаўленымі перад ім задачамі.

Але ён павінен справіцца. Гэта значыць, што неабходна асвяжыць атмасферу ў тэатры, умацаваць кіраўніцтва, асабліва партыйнае.

Мы не можам абмяжавацца стварэннем адной толькі оперы «На купаллі». Ужо цяпер трэба разгарнуць падрыхтоўку да стварэння новых опер на матэрыяле сучаснай Совецкай ордэнаноснай Беларусі. Для гэтай работы трэба прыцягнуць усіх лепшых беларускіх пісьменнікаў і кампазітараў, вывучыць лепшы вопыт Масквы, Ленінграда і Кіева.

Народы ордэнаноснай Совецкай Беларусі павінны атрымаць вялікую совецкую оперу. Гэта справа гонару як работнікаў тэатра, так і літаратараў і кампазітараў.

МАСКВА—ЗЯМЛЯ ФРАНЦА ІОСІФА

Вялікі арктычны пералёт Масква — Зямля Франца Іосіфа.
НА ЗДЫМКУ паказан маршрут пералёту тав. Вадап'янава і Махоткіна. Фотамантаж Саюзфото.

Тут будзе школа

Гэта была адна з глухіх ускраін Менска. Тут стаялі нізенькія хаткі з пахілымі брамамі. Вузкая, незабрукаваная, выбоістая вуліца. Паабапал яе рассціляліся карлікавыя сады. Так выглядала Слонімская вуліца.

Зіма 1936 года парушыла яе мірны спакой. Прыехалі пяцітонныя аўтамашыны, з'явіўся камень, пілены лес, цэмент, цэгла. Сярод нізенькіх хатак пачаў узрастаць вялікі будынак.

Першыя дні прараб будаўніцтва тав. Фруман адчуваў сябе, як шкіў, раптоўна пераключаны на парожні ход. Былі матэрыялы, і рабочыя — не было каштарысаў і рабочых чарцяжоў.

Але справа ўладзілася. Будаўнічы аддзел Наркомасветы прадставіў рабочыя чарцяжы і каштарысы. Кладку цэглы рабілі нават пры вялікіх марозах. Гэта дало нядрэнныя вынікі.

На сёнешні дзень поўнасцю закончана цагельная кладка. Усяго ўкладзена 406 тысяч цаглін, палова даха пакрыта бляхай, паміж паверхамі ўкладзены бэлькі, падшыта палова столяў. Зараз пачата атынкоўка сцен.

Рабочыя будаўніцтва абавязаліся да 1 мая закончыць першы паверх, а ў канцы ліпеня поўнасцю здаць гатовы будынак.

Гэта будзе новы, зусім не падобны да нізенькіх хатак, будынак. У ім будзе сталінская дзесяцігадовая школа.

І. ЕСЬМАН.

Вялікія арктычныя пералёты

ВАДАП'ЯНАЎ ДАСЯГНУЎ МАТАЧКІНА ШАРА

АРХАНГЕЛЬСК, 6 красавіка. (БЕЛТА). Самалёты Вадап'янава і Махоткіна сёння, у 9 гадзін 25 мінут, пакінуўшы Амдэрму, узялі напрамак на Матачкін Шар. Радыёстанцыя Амдэрмы трымае з самалётамі безупынную сувязь.

Праз дзве гадзіны пасля вылету Вадап'янава і Махоткіна з Амдэрмы ад іх атрымана радыёграма, у якой паведамляецца, што самалёты ідуць брыючым палётам над пакрытым ільдамі Карскім морам з хуткасцю звыш 180 клм. у гадзіну.

Сёння, у 12 гадзін 35 мінут, герой Совецкага Саюза Вадап'янаў дасягнуў Матачкіна Шара і ўдала прызямліўся. Махоткін, не даляцеўшы, зрабіў вымушаную пасадку ў бухце Варнека, у раёне Карскіх Варот, бо згубіў з віду Вадап'янава.

IX з'езд комсамола Украіны

КІЕЎ, 6 красавіка. (БЕЛТА). На вячэрнім пасяджэнні з'езда комсамола Украіны 5 красавіка прысутнічалі таварышы Касіор, Постышаў, Петроўскі, Папоў.

З выключнай увагай з'езд выслухаў яркую, багатую зместам прамову сакратара ЦК КП(б)У, любімага парторга комсамола Украіны тав. Постышава. Бурнымі апладысментамі віталі дэлегаты ключную частку прамовы тав. Постышава, прысвечаную мудраму правадыру народаў тав. Сталіну.

*

У Кіеве адкрыўся Палац фізкультуры імя С. В. Касіора. У ім светлыя, прасторныя спартыўныя залы, самы вялікі на Украіне водны басейн, зімовы тэнісны корт, валейбольныя і баскетбольныя пляцоўкі.

Дэманстрацыя гатоўнасці да процівапаветранай абароны

КІЕЎ, 6 красавіка. (БЕЛТА). Сёння ў гонар IX з'езда ленінскага комсамола Украіны адбылася дэманстрацыя працоўных сталіцы ў супрацьгазах.

На плошчы Герояў Перакопа на трыбуне таварышы Касіор, Постышаў, Петроўскі, Любчэнка, Папоў, Якір, Баліцкі, сакратар ЦК ВЛКСМ тав. Файнберг, сакратар ЦК ЛКСМУ тав. Андрэеў, ордэнаносцы і ўвесь склад прэзідыума IX з'езда комсамола.

Чоткім строем ішлі шматтысячныя калоны прадпрыемстваў і ўстаноў сталіцы ў супрацьгазах. Дэманстрацыя гатоўнасці да супрацьпаветранай і санітарнай абароны зрабіла велічнае ўражанне. Маніфестацыя калон цягнулася тры гадзіны. Міма трыбуны за гэты час прайшло звыш 60 тысяч працоўных.

АБ ПЛАНЕ АРГАНІЗАЦЫІ РАЗВОЗНАГА ГАНДЛЮ НА ЧАС ВЕСНАВОЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ 1936 года

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

Для арганізацыі лепшага абслугоўвання калгасаў і калгаснікаў, соўгасаў і МТС у часе веснавой пасеўнай кампаніі, Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Зацвердзіць прадстаўлены Народным камісарыятам унутранога гандлю план арганізацыі і разгортвання развознага гандлю: па лініі спажыўкааперацыі — 210 адзінак, Белпромгандля — 40 адзінак і Белхарчгандля — 15 адзінак; разноснага гандлю: па лініі спажыўкааперацыі — 327 адзінак, Белпромгандля — 60 адзінак і Белхарчгандля — 25 адзінак.

2. Абавязаць НК унутранога гандлю і Белкаапсаюз забяспечыць праз свае мясцовыя органы распрацоўку і ўзгадненне з горсоветамі і РВК маршрутызацыі і прымацавання развознага і разноснага гандлю па калгасах, МТС, соўгасах і паасобных палявых брыгадах і арганізацыі прыёму заказаў развозкамі з дастаўкай тавараў паследуючым рэйсам.

3. Даручыць НК унутранога гандлю і Белкаапсаюзу:

а) забяспечыць завоз у крамы сельпо і дзяржгандлю ў дастатковай колькасці тавараў, на якія прад'яўляецца попыт у час пасеўнай кампаніі: шорныя вырабы, вяроўкі, калёсная мазь, дробны сельскагаспадарчы інвентар, гаспадарчыя тавары, а таксама цукар, чай, мыла, кандзіцерскія вырабы, табак, папяросы, запалкі, алоўкі, блок-ноты, папера пісчая і курыльная, дробная галантарея і т. д.;

б) устанавіць гадзіны гандлю ў крамах сельпо і дзяржгандлю так, каб падпарадкаваць работу крам рабоце калгаснікаў і рабочых соўгасаў на полі (да пачатку выхаду ў поле і пасля сканчэння дзеннай работы на полі).

4. Абавязаць базы прамысловасці безагаворачна выконваць у першую чаргу адгрузкі па нарадах для патрэб пасеўнай кампаніі.

Нам. Старшыні Совета Народных Камісараў А. СААКЯН.
Кіраўнік Спраў Совета Народных Камісараў БССР І. ЛУК'ЯНЧЫК.
5 красавіка 1936 г.

АКТЫВІСТЫ АБАРОНЧАЙ РАБОТЫ

Удзельнікі пераходу Менск — Масква, рабочыя фабрыкі «Кастрычнік», узнагароджаныя ордэнамі «Знак почета» і граматамі ЦВК СССР. НА ЗДЫМКУ, першы рад злева направа: Валошына, Маляўскі, узнагароджаны ордэнам «Знак почета», Элентух, Свершчук, Ушэр, узнагароджаныя граматамі ЦВК СССР. Другі рад, злева направа: Серабранскі (камандзір пераходу), узнагароджаны ордэнам «Знак почета», Грозоўскі — граматай ЦВК СССР, Еўсюціна Ксенія—ордэнам «Знак почета». Трэці рад, злева направа: Галавач — ордэнам «Знак почета», Гутфрайнд—граматай ЦВК СССР, Цапліцкая, Еўсюціна В. і Кісялёва—ордэнамі «Знак почета».
Фото Каплінскага.

КАМАНДЗІРЫ ЗЯМЛІ

П. ШАСТАКОЎ

— Мы камандзіры зямлі... Загадаем ёй — дай і яна дасць...

Так напісалі ў сваім пісьме два калгасныя брыгадзіры — Мікіта Доўгі і Лейба Курцэр. Першы з калгаса «Чырвоная Дуброва», другі — з інтэрнацыянальнага калгаса «Соцвег» (соцыялістычны шлях). Калгасы гэтыя знаходзяцца ў Парыцкім раёне, а пісьмо было зачытана на раённым злёце калгасных звеннявых у Парычах 25 сакавіка.

Да пісьма аднадушна далучыліся больш сотні ўдзельнікаў злёта. І зварот двух брыгадзіраў і іх прамовы з трыбуны злёта, як і выступленні іншых прамоўцаў, гучэлі, здавалася, нейкай залішняй, супакойваючай упэўненасцю:

— Шапкамі закідаем!

А абавязацельствы, якія браліся і ў пісьме, і ў прамовах, патрабавалі больш чым шапак, больш чым гучных слоў.

— 20 цэнтнераў зернавых з гектара.

— 250 цэнтнераў бульбы.

— 5 і нават 6 цэнтнераў ільнасемя.

Дарэмна прамоўцаў перасцерагалі з прэзідыума:

— Гэтыя лічбы — не жарты...

— Тут аднымі словамі не прымусіш зямлю.

— А гною колькі вывезена?

Настрой усё роўна выходзіў з берагоў, як веснавая паводка. Людзі, відаць, не жартавалі. Нішто не давала падставы, каб абвінаваціць каго-небудзь у дзіцячай наіўнасці ці, яшчэ горш, у нявечырасці. Гаварылі не дзеці і не чужакі.

Мікіта Доўгі і Лейба Курцэр доўга меркавалі аб ураджайнасці зернавых. Маленькая постаць Мікіты (ён толькі па прозвішчу Доўгі) нервова варушылася ў прасторным кажуху. Напружаная думка моршчыла лоб. Лічба — дваццаць цэнтнераў з гектара — стаяла перад Мікітай у канкрэтных участках поля, у запасах гною, у становішчы коней, у настроі людзей. Ён, відаць, хістаўся і ўступіў напору Курцэра толькі пасля таго, як атрымаў на гэта згоду звеннявой 1-га звяна Ульяны Шчэрбінай, якая тут-жа сядзела за сталом у прэзідыуме.

І Мікіта Васільевіч Доўгі, і Ульяна Мікіцічна Шчэрбіна, і Лейба Бенцыянавіч Курцэр — былі ўдзельнікамі ўсебеларускай нарады па ўздыму ўраджайнасці.

**

Халодны вецер мяце пыл па вуліцы вёскі Дубровы. Холад гоніць людзей у хаты. У памяшканні праўлення калгаса «Чырвоная Дуброва» стрыманы гул галасоў. Падрыхтоўваецца свежы нумар насценгазеты. У адной з заметак імёны перадавікоў — Мікіта Доўгі, Шчэрбіна Ульяна, Шчэрбіна Харыта...

— Дзе можна ўбачыць Мікіту? — пытаюцца прыезджыя.

— А што трэба? Я — Мікіта! — адказвае высокі хударлявы стары ў кажуху, і па твару яго, заросламу рэдкай сівой барадой, прабягае ўсмешка.

— Нам трэба Мікіту Доўгага...

— А-а, Доўгага? — цягне фальшыва кажух і ўсмешка на твары робіцца больш выразнай...

Прадметам гутаркі робіцца Мікіта Доўгі.

За акном сонечны дзень і пыльная вуліца. Табачны дым гоніць людзей з хаты, прымушаючы іх забываць, што сонца хоць і свеціць, але мала грэе.

Ля пажарнага «дэпо» натоўп.

— А вунь і Кузьма Аляксеевіч ідзе.

Да натоўпу набліжаецца прысадзісты чырвонатвары Кузьма Аляксеевіч Бусел. Ён малайцавата разбірае на два бакі густую сівую бараду і робіць «смірна» ў трох кроках ад натоўпу.

Але, ні ўдалая каманда былога «хлопцкага», ні яго «пажыраючы» стараслужацкі выгляд нікога асабліва не пацяшаюць. Усё гэта — знешняе, штучнае, выкліканае часткова гарэлкай і, галоўным чынам, прысутнасцю прыезджых. Нават стары Мікіта Бусел, той самы, што гаварыў пра «хлусню» Доўгага, з крывой грымасай пазірае на Кузьму. Ведае Мікіта Бусел, што гэты Кузьма ў двух асобах. Адзін Кузьма перад натоўпам, перад чужымі людзьмі блазнам прыкідваецца, а другі Кузьма — былы ўласнік ветрака (цяпер калгаснага).

Ведае і разумее «другога» Кузьму стары Мікіта Бусел таму, што і ў яго, у Сібіры, была вялікая гаспадарка, аб якой ён з неахвотай расказвае нешта туманнае.

— Было шмат коней... Хацелі раскулачыць, але я сам збыў...

А вунь шпарка ідзе па вуліцы і Мікіта Доўгі. Падкаваны бот чотка адбівае крок па замёрзлай зямлі. Якімі вачыма пазіраюць на брыгадзіра Доўгага старыя Мікіта і Кузьма Буслы? У гэтых вачах і трусасць, і зайздрасць, і варожасць. Мікіта Бусел адказвае зараз толькі за апальванне печкі ў канцэлярыі калгаса, а Кузьма Бусел — толькі млынар на калгасным ветраку...

Затое Мікіта Доўгі адчувае сябе поўным гаспадаром. Вось пойдзем зараз з ім на калгасны двор. Лепшая павець — гэта брыгады Мікіты Доўгага. У парадку складзены сані і расстаўлены радком адрамантаваныя плугі — гэта Мікітавай брыгады. Лепшае сена на корм у час пасеўнай — гэта ў пуні трэцяй брыгады Доўгага. У парадку хамуты.

Чотка расстаўлены людзі ў трэцяй брыгадзе. Усе сем звенняў сёння заняты вывазкай угнаенняў. Мікіта Васільевіч ведае, што робіць кожны чалавек.

— Ульяна Шчэрбіна і Мар'я Сушкова ў лесе за попелам.

— Сцяпан і Аксіння Буслы падвозяць лісце і іглічу на ўрочышча «Асінавая даліна».

Усе звенні на гэтыя-ж дальнія палі давозяць апошні гной.

**

Вечарам у хаце Мікіты Васільевіча апрача яго сям'і — жонкі і чатырох дачок — група суседніх дзяўчатак ад чатырох да дзесяці год. Дзеці без асаблівых упрошванняў распачынаюць песні. Стройна і ўпэўнена яны спяваюць пра атрад партызан, які праходзіў «по сибирским горам и долинам», пра буржуяў, якія хацелі «напіцца рабоча-сялянскай крыві», пра вінтовачку чырвоную, якая «без промаху будзе страляць»...

А пад гукі дзіцячых галасоў звеннявая першага стаханаўскага звяна Ульяна Нікіцічна Шчэрбіна дакладвае свайму брыгадзіру аб вывазцы з лесу новых скрынь попелу.

У роўнай, дзелавой гутарцы дзяўчыны і следу няма той збянтэжанасці, якая так псавала выступленне Ульяны з трыбуны на злёце звеннявых.

— За дзень прывезла паўтары тоны попелу...

Задаволенасць вынікамі працы ажыўляе дзяўчыну. Што перад гэтым не зморанасць, або лаянкі старой маткі! Яна марыць аб заўтрашнім дні, аб працы, якая робіць яе, былую батрачку, карысным чалавекам калгаснай грамады...

Вось яна зараз пойдзе дамоў і ў цішы ночы мары яе пранясуцца ў Менск, дзе яна асабліва адчула сябе поўнацэнным чалавекам, а можа і ў Маскву...

Брыгадзір Мікіта Васільевіч Доўгі, былы бядняк, і звеннявая першага звяна яго брыгады Ульяна Нікіцічна Шчэрбіна маюць права называцца камандзірамі зямлі. У агульным ланцугу калгасных байцоў за высокі ўраджай гэта — надзейнае звяно. Не Кузьма і Мікіта Буслы, не старая маці Ульяны вырошчваюць лёс заўтрашняга дня.

Да сонца заўтра будуць на нагах Мікіта, Ульяна, Харыта і дзесяткі лепшых калгасных людзей. Не захочуць і іншыя брыгады і звенні быць апошнімі...

Заварушыцца калгаснае жыццё. Бадзёрасцю і радасцю будуць гучаць з дзевяці раніцы звонкія галасы ў школе і на пляцоўцы.

Шасцігадовы Вася Друзік, сын былога жабрака, з вялікім захапленнем перакажа пісьмо Варашылаву:

«...А як стрэне куля брата
на вайне,
Таварыш Варашылаў, напішыце
мне.
Я за яго стану ў баявых радах
Я ўжо трымаю стрэльбу
ў руках».

Ніхто не смяецца, што Вася Друзік не дружыць з літарай «р» і замест «брат» выказвае «блат». Дзяцей захапляе настрой Васі, а з літарай «р» многія з іх не ў ладах. Прыдзе ў свой час і «р». А зараз на іх урачыста ззяючых тварах святло раніцы новага калгаснага дня. Гэтае святло праменіцца і з вачэй цёці Мані, кіраўніцы дзіцячай пляцоўкі...

**

Мы былі ў гасцях і ў Курцэра. «Соцвег» — вялікі інтэрнацыянальны калгас, і Лейба Бенцыянавіч Курцэр адыгрывае ў ім выключна адказную ролю. Ён сваім прыкладам задае тон усяму калгасу. Брыгада Курцэра, трэцяя брыгада, знаходзіцца за 2—3 кілометры ад мястэчка Шчэдрын, ад цэнтра калгаса. У брыгадзе дваццаць сем'яў — палова беларускіх, а палова польскіх. Калгаснікі раскіданы па пасёлках. Толькі энергія і арганізацыйныя здольнасці брыгадзіра Курцэра і маглі тут навесці парадак.

— Дрэнную спадчыну пакінуў мне памешчык Мурашка... Бачыце, прыходзіцца папраўляць, да будоўваць... — смяецца Курцэр.

Пра Курцэра склалася не зусім правільная думка сярод калгаснікаў у мястэчку Шчэдрын, што ён «можа перагнуць». Гэтую думку падтрымлівае нават і старшыня калгаса т. Краўцоў. Праўда, іншы раз залішне марыць Лейба Бенцыянавіч, аднак ніхто не абвінаваціць яго ў тым, што ён усімі сіламі не імкнецца гэтыя мары ажыццявіць.

— Бачыце, як вокам кінуць, поле застаўлена кучамі гною... За горкай яшчэ не відаць краю.

— Але ў хлявах і на двары таксама шмат...

— Вывезем. Гэта пад бокам... Пад бульбу і лён вывезем, — упэўнена заяўляе Курцэр.

Калгаснікі з брыгады Курцэра з надзвычайнай цеплынёй гавораць пра свайго брыгадзіра.

— Наш Лейба Бенцыянавіч не праспіць.

І гэта характарыстыка больш правільная, чым гутаркі ў мястэчку пра «загібы» Курцэра...

У гутарках з людзьмі Курцэр сапраўды не палезе за словам у кішэню. Затое і ў «гутарцы» з зямлёю ён — красамоўны і настойлівы камандзір зямлі. Тут ён добра ведае, як трэба загадваць зямле, каб яна дала высокі ўраджай.

Калгас «Соцвег» апраўдвае сваю назву. Як і калгас «Чырвоная Дуброва», ён на правільным, соцыялістычным шляху. Багатае калгаснае будаўніцтва і бадзёрыя настроі людзей, настроі ўпэўненасці ў заўтрашнім дні даюць права лепшым камандзірам з гэтых калгасаў — Мікіце Васільевічу Доўгаму і Лейбе Бенцыянавічу Курцэру гаварыць мовай закліку з усёй калгаснай грамадой. Яны безумоўна будуць у першых радах барацьбітоў за высокі ўраджай, за выкананне соцдагавору з Кіеўскай і Чэрнігаўскай абласцямі, за выкананне абавязацельстваў, прынятых у іх уласным пісьме.

м. Парычы.

БЕСТУРБОТНЫ СТАРШЫНЯ

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА)

На тэрыторыі калгаса «Чырвоны партызан» (Гаўкачоўскі сельсавет, Шклоўскага раёна) недалёка ад лесу стаяла хата. Каля яе быў выкапан калодзеж. Два гады назад гэту хату адгуль перавезлі. Калодзеж без зруба пакінулі не засыпаным.

Пастух Лявонаў Сямён не раз звяртаўся да старшыні калгаса Папкова Ягора, каб засыпаць гэту яму, якая пагражае і жывёле і людзям, але апошні ніякіх мер не прымаў. Аднойчы ў калодзеж увалілася вучаніца Напоскава і прабыла там двое сутак. Дасталі яе адтуль ледзь жывую.

Пасля гэтага здарэння Папкова агульны сход калгаснікаў зняў з пасады старшыні. Выбралі Кандрацьева Дзяніса. Але і пры новым старшыні калодзеж так і застаўся незасыпаным.

ХРУЦКІ.

ЗАПАЗЫЧАНАСЦЬ КАЛГАСУ НЕ ПАГАШАНА

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА)

Сухараўскае сельпо, Чавускага раёна на працягу 1934—35 года атрымала ў калгасе «Рассвет» (Зарэцянскі сельсавет) 8.343 літры малака. Грошы за малако да гэтага часу калгасу не аплочаны.

Праўленне некалькі раз паведамляла пра гэта раённаму пракурору, але адказу не атрымала.

ПАНОЎ.

ПА ДЗЕДАЎСКАМУ ЗВЫЧАЮ

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА)

Чатыры гады назад калгас «Чырвоны ўсход», Каменскага сельсавета, Горацкага раёна, набыў радковую сеялку. Але за ўвесь гэты час сеялку ні разу не скарыстоўвалі. Яна стаіць і ржавее на дварэ ў калгасніка Мяжэвіча. Старшыня калгаса Дзядкоў лічыць, што з сяўбой можна ўправіцца і без машыны.

— Нашы бацькі век сеялі рукамі, і хлеб рос не горшы, — гаворыць ён.

Цікава, што гэтаму шводнаму разважанню сельсавет (старшыня Хахлоў) не дае адпору.

ФІЛАТАЎ.

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ «ЗВЯЗДЫ»

«ЦІ ПРАВОДЗІЛАСЯ Ў ЛОЕВЕ СТАХАНАЎСКАЯ ПЯЦІДНЕЎКА?»

Лоеўскі райком КП(б)Б паведаміў рэдакцыю, што ў артыкуле «Ці праводзілася ў Лоеве стаханаўская пяцідненўка» «Звязда» правільна ўскрыла недахопы работы рэдакцыі раённай газеты «Калгаснік».

Рэдакцыя газеты «Калгаснік» і яе рэдактар т. Кавалоў бюро райкомам КП(б)Б папярэджаны.

Рэдакцыі ўказана на неабходнасць большай аператыўнасці ў праводзімых мерапрыемствах па разгортванню стаханаўскага руху ва ўсіх галінах работы.

«КАЛІ-Ж ПРАВЯДУЦЬ РАДЫЁКРОПКУ?»

Пад такім загалоўкам у «Звяздзе» ад 22 лютага г. г. было змешчана пісьмо стаханаўца фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» (Віцебск) тав. Лістмангофа, якому на працягу трох месяцаў радыёвузел не ўстанаўляў радыёкропку.

Радыёвадзел беларускага кіраўніцтва сувязі паведаміў нам, што зараз радыёкропка ў кватэры т. Лістмангофа ўстаноўлена.

У КАЛГАСЕ ОРДЭНАНОСЦА БЯЛЕЦКАГА

МАЗЫР. (Кар. «Звязды»). 28 сакавіка ў сельскагаспадарчай арцелі імя Куйбышэва, Мазырскага раёна, дзень быў незвычайны. Калгас атрымаў даяржаўны акт на вечнае карыстанне зямлёй у колькасці 1.170 гектараў. Дзень гэты знамянальны яшчэ і тым, што чатыры брыгады калгаса выехалі араць пад яравыя. Старшыня калгаса — ордэнаносец **Бялецкі Станіслаў Ігнацьевіч** пры выездзе ў поле правяраў кожную брыгаду, пабыў на брыгадных участках.

Першыя дні палявых работ паказваюць, што куйбышэўцы на справе змагаюцца за апраўданне высокай узнагароды, якую атрымаў іх старшыня ад саюзнага ўрада.

У мінулым годзе куйбышэўцы ўпершыню на Палессі дабіліся 5,4 цэнтнера ільновалакна і 7 цэнтнераў пенькавалакна з гектара. Па свайй якасці ільнопенькапрадукцыя далёка перавысіла планавыя меркаванні.

Сёлета яны рашылі атрымаць стаханаўскі ўраджай на аснове іх леташняга вопыту.

У чым ён заключаецца. Перш за ўсё ў правільным падборы зямельных участкаў пад каноплі і лён і добраякаснай іх апрацоўцы. У мінулым годзе гэтыя культуры сеяліся калгасам выключна на бульбянішчы. Прычым пад каноплі гной вывозіўся і заворваўся на зіму. Вясной, як толькі прасыхала зямля, зяблева зноў пераворвалася і ў такім выглядзе заставалася ляжаць аж да самай сяўбы канапель. Перад самай сяўбой глеба яшчэ раз пераворвалася, баранавалася і адразу-ж пускалася радковая сеялка.

Такім чынам усё пустазелле, якое мелася ў глебе, было знішчана, і каноплі выраслі, як кажуць, на славу. Росту канапель спрыяла яшчэ і тое, што іх падкормлівалі на корані. Калі ўсходы пачыналі засланяць сабою глебу і можна было добра разлічыць, дзе маладыя расліны адстаюць у росце, там іх падкормлівалі гнаевай жыжай. Рабілася гэта так. На два вядры вады бралася адно вядро гнаевой жыжы з-пад рагатай жывёлы, і гэтым растворам падкормліваліся ўсходы.

Падкормка на корані хутка давала добрыя вынікі.

Праз некалькі дзён хімія ўсходы пачыналі ажываць і разам з усёй масай маладых раслін узнімаліся ўгару.

У гэтым годзе 7 гектараў канапель засяваюцца на леташнім канаплянішчы. Увосень на гэты ўчастак быў вывезен добры гной і заараны на зіму. Зараз зяблева пераворана, а перад самым пасевам канапель будзе ўзарана яшчэ раз. У адрозненне ад мінулага года ў дадатак да гною будзе ўнесена мінеральнае ўгнаенне — сернакіслы амоній. Апошняга набыў калгас 14 цэнтнераў.

Як і ў мінулым годзе, увесь лён будзе засеян выключна на бульбянішчы. На агульным сходзе калгаснікаў пастанавілі скарыстаць пад лён 4 гектары прысядзібных участкаў з заменай іх на адзін год у агульным масіве.

Пад лён, як і пад каноплі глеба ўжо ўзарана і будзе пераворвацца яшчэ раз перад самай сяўбой.

Будучы ў Маскве на нарадзе перадавікоў па ільну і канопляхз кіраўнікамі партыі і ўрада, ордэнаносец Бялецкі даў абяцанне таварышу Сталіну, што яго калгас даб'ецца ў гэтым годзе не менш як 10 цэнтнераў пенькавалакна і 7 цэнтнераў ільновалакна з гектара. Гэта абяцанне натхняе зараз калгаснікаў на яшчэ большую барацьбу за высокі сталінскі ўраджай не толькі па каноплях і ільну, але і па зернавых культурах.

І сапраўды, ні можа быць больш ганаровай задачы для добрасумленнага калгасніка, як выканаць абяцанне, дадае любімаму правадыру народаў. І гэтай ганаровай задачай зараз жыве кожны калгаснік, кожная калгасніца арцелі імя Куйбышэва.

Р. ФРАЛОЎ.

СТАХАНАЎЦЫ ЗА ВУЧОБАЙ



Звеннявая калгаса «Камінтэрн», Петроўскага раёна, Кіеўскай вобласці, тав. Марына ГНАТЭНКА ўзнагароджана ордэнам Леніна за ўзорную работу на калгасных палях і дасягненне ўраджаю цукровых буракоў 500 цэнтнераў з гектара. Тав. Гнатэнка рыхтуецца да паступлення восенню гэтага года ў сельскагаспадарчы інстытут.

НА ЗДЫМКУ: тав. Гнатэнка за вучобай.

Фота ШЫРОКАВА (Саюзфота).

АГЛЯД ДРУКУ

КАЛГАСНІКІ ЗДАЮЦЬ АГРАТЭХЭКЗАМЕН

У пачатку студзеня г. г. калгаснікі калгаса «Новае жыццё», Антонаўскага сельсавета, звярнуліся з пісьмом да ўсіх калгаснікаў Чавускага раёна. У сваім пісьме яны пісалі аб велізарным значэнні аўладання агратэхнікай у барацьбе за 7—8 мільярдаў пудоў хлеба. Яны заклікалі разгарнуць агразоатэхнічную вучобу ва ўсіх калгасах і прасілі аграномаў, зоатэхнікаў і ветурынарных урачоў раёна дапамагчы ў гэтай справе.

Чавуская раённая газета «Калгасны сцяг» надрукавала пісьмо. І праз некалькі дзён у рэдакцыю пачалі паступаць водгукі. Першым на пісьмо калгаснікаў «Новага жыцця» адгукнуўся актыў Антонаўскага сельсавета. Пры сельсавеце арганізавана школа калгаснага актыва, у якой навучаецца каля 60 чалавек, у калгасах арганізаваны агразоагурткі. Следам за Антонаўскім сельсоветам школы калгаснага актыва былі арганізаваны ў Дужаўскім, Ваўкавіцкім, Прудкоўскім сельсоветах.

«Калгасны сцяг» сістэматычна паведамляў аб арганізацыі школ і агрогурткоў у сельсоветах і калгасах раёна, час-ад-часу друкаваў артыкулы «У дапамогу агратэхгурткам». 26 школ калгаснага актыва арганізаваны ў сельсоветах раёна. Рэгулярна працуюць 14 школ. Вось, напрыклад, што пішуць слухачы ваўкавіцкай школы калгаснага актыва ў раённую газету:

«Два разы ў тыдзень мы збіраемся пры сельсавеце, дзе з намі займаюцца аграном і настаўнікі, вывучаем агратэхніку, матэматыку, прыродазнаўства і вучымся граматна пісаць».

Слухачы школы пішуць і аб тым, як яны прымяняюць атрыманыя веды ў рабоце па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

«Да пачатку сяўбы (не пазней сакавіка месяца) здадзім агратэхэкзамен»

— запэўняюць слухачы школы.

Да агратэхэкзамена рыхтуецца не толькі калгасны актыў Ваўкавіцкага сельсавета, 27 сакавіка на нарадзе стаханаўцаў Антонаўскага сельсавета старшыня калгаса «Новае жыццё» заявіў, што 15 калгаснікаў — ініцыятараў паходу за аўладанне агратэхнікай гатовы здаць агратэхэкзамен. Яго падтрымаў старшыня сельсавета тав. **Пісараў**, дадаўшы, што ўвесь камандны склад калгасаў сельсавета гатовы здаць экзамен, і патрабаваў ад рэдакцыі раённай газеты прыслаць у сельсавет камісію для правядзення экзамена.

Гатовы здаць агратэхэкзамен калгасны актыў 8 сельсаветаў раёна.

Але чавуская газета не абмежавалася толькі гэтым. 8 сакавіка ў калгасе «Ўдарнік», Прудкоўскага сельсавета, калгасніца **Вера Дзюбакова** арганізавала жаночае звяно, якое паставіла мэтай дабіцца 10 цэнтнераў ільновалакна з гектара. Хутка такія звенні арганізаваліся ў дзесятках калгасаў раёна. Па ініцыятыве газеты звяно Веры Дзюбаковай, брыгадзіры калгасаў «Юны камунар», «Новае жыццё», «Камуністычны маніфест» звярнуліся з пісьмом у Беларускую акадэмію навук з просьбай дапамагчы ім агратэхнічнымі парадамі.

Трэба сказаць, што Акадэмія навук хутка і надзвычай канкрэтна адгукнулася на пісьмо. У раён прыехаў прадстаўнік Акадэміі аграном т. **Чацверыкоў**. Ён пабываў у калгасах «Новае жыццё», «Юны комунар», «Чырвоная зорка», «Ударнік», імя Варашылава, правёў гутаркі з калгаснікамі, нарады калгаснага актыва, распрацаваў з імі практычныя аграмерапрыемствы. Са звяном Веры Дзюбаковай прадстаўнік Акадэміі навук распрацаваў дэтальны агрэплан барацьбы за 10 цэнтнераў ільновалакна з гектара. Газета «Калгасны сцяг» надрукавала план і гэтым самым аказала вялікую дапамогу ўсім калгасам раёна.

Пачаты газетай паход за аўладанне калгаснікамі агратэхнікай — добрая, каштоўная справа, якую варта пераняць і іншым раённым газетам.

Парушылі агратэхнічныя правілы

ТУРАЎ. (Спец. кар. «Звязды»). Калгаснікі арцелі «Чырвоны баец», Рагоўскага сельсавета, скардзяцца, што іх глеба вельмі цяжкая. Вядома, што такая глеба патрабуе добрай апрацоўкі. На цяжкім суглінку трэба асабліва змагацца за выкананне ўсіх агратэхнічных правіл.

Для добрай апрацоўкі глебы калгас мае ўсе магчымасці. Палявыя работы тут пачаліся задоўга да сяўбы. Вось ужо блізка двух тыдняў калгаснікі рыхтуюць глебу пад пасеў ранніх яравых культур. Здавалася-б, што якасць работы павінна быць высокая, каб глеба была апрацавана належным чынам. Але якраз у калгасе не звяртаюць увагі на якасць работы. Пры апрацоўцы глебы парушаюцца элементарныя правілы агратэхнікі. Зяблева перад ворывам як правіла не барануецца. Ворыва атрымліваецца няроўнае, зусім мелкае, усё на агрэхах. Глеба цвёрдая, не разбітая і насенне застаецца наверсе, або дзе пад грудай аямлі.

Характэрна, што ў гэтым калгасе, які абслугоўваецца Тураўскай МТС, парушэнне агратэхнікі нагляджаецца галоўным чынам пры рабоце трактарэй. Трактары барануюць зяблева не ўпоперак, а ўдоўж вагонаў. Пры такім баранаванні зяблева не разбіваецца, а толькі загладжваецца для адводу вачэй. Клочча ніколькі не растрасаецца і пустазелле беспарашкодна прадаўжае свой рост. І калі праходзіш па полі, дзе баранаванне праведзена ўдоўж вагонаў, праз тры-чатыры дні пустазелле пакрывае ўсю глебу.

Парушэнне агратэхнікі нагляджаецца і ў выкарыстанні гною. Большасць калгасаў кладуць гной на полі маленькімі кучкамі. У гэтых кучках ён ляжыць па тыдню і больш. Вецер і сонца высушваюць усе карысныя матэрыі гною і ён губляе сваю каштоўнасць.

Рад калгасаў, толькі прыступіўшы да сяўбы зернавых, ужо дапусцілі многа хібаў. Нагляджаюцца спробы сеяць зернавыя ўручную, тады як ёсць радковыя сеялкі. Калгас «Чырвоны пагранічнік» засеяў рукамі 20 гектараў аўса. Радковая-ж сеялка стаіць без работы.

Гэты факт гаворыць аб тым, што ў пагоні за тэмпамі калгасы забываюць аб галоўнай задачы — барацьбе за якасць. І гэта застаецца без увагі раённых арганізацый.

А. ЛОСЬ.

НА ГАЛІННАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ ВАРШТАТА-МАШЫНАБУДАЎНІЧАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Пад знакам самакрытыкі

У 1936 годзе металапрамысловасць БССР павышае на 20 проц. выпуск свайй прадукцыі ў параўнанні з мінулым годам. Праграма вытворчасці сельскагаспадарчых машын павялічваецца ў 4 разы. 14 проц. агульнага выпуску варштатаў па Саюзу дадуць сёлета металазаводы БССР. Некаторыя тыпы варштатаў вырабляюцца толькі ў нас, у БССР. Мы снабжаем такія важнейшыя галіны прамысловасці, як аўтатрактарная, авіяцыйная і інш.

Гэтыя лічбы, прыведзеныя ў дакладзе дырэктара Белметалтрэста т. Левіна на галіннай канферэнцыі варштата-машынабудаўнічай прамысловасці, з'яўляюцца яркай ілюстрацыяй далейшага безупыннага росту машынабудаўніцтва ў БССР.

— Стаханаўскі рух, — кажа тав. Левін, — даў нам магчымасць датэрмінова выканаць план 1935 года на 116 проц. па ўсяму трэсту. У чацвертым квартале выпушчана прадукцыі звыш плана на 1 мільён рублёў. Не дрэнна прапавалі заводы і ў першым квартале. Наогул план выканан на 108,6 проц., пры тым выпушчана прадукцыі на 1 млн. 59 тыс. рублёў.

Аднак, трэба з усёй сур'ёзнасцю адзначыць, што некаторыя металазаводы пагналіся за колькаснымі паказальнікамі. Яны выпускалі тую прадукцыю, якую лягчэй вырабляць і не выканалі асноўны паказальнік — планавы асартымент.

Віцебскі завод імя Кірава недадаў у першым квартале тысячу акучнікаў, замест прадугледжаных 200 ільноперабілак выпушчана 40. Бабруйскі завод імя Сталіна з 25 турбін па плану даў толькі адну. Завод «Камінтэрн» (Віцебск) нават і не прыступіў да выпуска конных прывадаў. Кіраўнікі прадпрыемстваў не скарысталі ўсе свае магчымасці, не мабілізавалі стаханаўцаў і ўсю рабочую масу на выкананне адказнага задання па выпуску сельскагаспадарчых машын.

Значна недавыканан план па выпуску такарных варштатаў, гайканарэзных, прадольна-строгальных.

Тав. Левін асабліва падкрэсліў недапушчальныя, безадказныя адносіны дырэктароў заводаў да выпуску тавараў шырпатрэбу. Віцебскі завод імя Кірава (дырэктар Сліозберг) доўгі час вазіўся з выпускам простых пласкагубцаў, і нарэшце яны аказаліся нягоднымі для рынку. Зараз завод зусім спыніў іх выраб. Завод «Камінтэрн» (Віцебск) падрыхтаваў штампы для выпуску амерыканскай адвёртак. Аднак да гэтага часу ў масавую вытворчасць яе яшчэ не пусцілі, а патрэбы ў гэтых адвёртках велізарныя. Завод імя Варашылава (дырэктар Шолкаў) «не можа» асвоіць простага гаспадарчага малатка.

Дрэнна і з якасцю прадукцыі. Процант браку даволі вялікі. Па гомельскаму заводу імя Кірава брак даходзіць да 6,6 проц. Ліцейны цэх віцебскага завода імя Кірава (начальнік Горскі) павялічыў брак да 11,8 проц., па заводу імя Варашылава — да 4,8 проц. Тут за апошнія месяцы забракавана 14 строгальных варштатаў.

Асноўная задача, пастаўленая перад намі студзеньскім пленумам ЦК КП(б)Б на павышэнне якасці прадукцыі і эканоміі метала, выконваецца недастаткова.

На 1936 год на заводах трэста намечан рост прадукцыйнасці працы на 38,2 проц. У першым кварталe гэты паказальнік неравышан на 5—6 проц.

Стаханаўцы прынялі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да галіннай канферэнцыі, у пераглядзе старых норм. На радзе заводаў яны выступілі супроць праектавання заніжаных норм тэхнічна-нарміровачным бюро (Орша). І ўсё-ж мы маем такі факт, што кіраўнікі завода «Чырвоны баец» (Орша), не гледзячы на ўказанні стаханаўцаў, правялі свой «праект» заніжаных норм, і з гэтым яны прыехалі на канферэнцыю.

***

На раніцу пасяджэнні 6 красавіка пачаліся спрэчкі па дакладу т. Левіна. Выступілі начальнікі ліцейных цэхаў завода імя Кірава (Гомель) тав. Рабкін, завода імя Кірава (Віцебск) тав. Горскі, Каган (завод «Чырвоны барэц»), Айзман (завод імя Варашылава), стаханаўцы бабруйскага завода імя Сталіна Чэранкоў, Бабылёў, Мангрос—завод імя Кірава (Гомель), Васілеўскі, Кісялёў — завод імя Кірава (Менск), Склярaў (сакратар ЦК саюза сярэдняга машынабудаўніцтва) і загадчык прамысловa-транспартным аддзелам ЦК КП(б)Б тав. Готфрыд.

7 красавіка пачалі працаваць секцыі.

Патураюць сабатажнікам стаханаўскага руху

ВІЦЕБСК. (Кар. «Звязды»). За студзень і люты панчошна-трыкатажная фабрыка «КІМ» перавыдаткавала 686 кілаграмаў поўшоўкавага пялатна і 22 тоны прадзіва. Па вязальнаму цэху адыходы ў лютым складалі 9,4 проц. замест дапускаемых планам 7 проц. Фабрычныя арганізацыі да гэтага часу яшчэ не распрацавалі нарматывы выдаткавання прадзіва па нумарах на адзінку вырабу. Гэта адносіцца да жаночых панчох 13 і 15 артыкулаў, мужчынскіх наскоў 160 артыкула, дзіцячых наскоў (усіх размераў) і інш.

Стаханаўка вязальнага цэха тав. **Шандарэнка** гаворыць, што работніцы не ведаюць, колькі прадзіва павінна пайсці на панчоху або насок таго ці іншага размеру. У мінулым годзе работніцам перыядычна падлічвалі размеры эканоміі і прэміравалі за эканомію. Зараз гэтага няма. Кожная работніца бярэ прадзіва, колькі ёй уздумаецца і менш за ўсё клапоціцца аб эканоміі.

Зусім дрэнна абстаіць справа з якасцю прадукцыі. Якасць фарбавання як панчошных, так і трыкатажных вырабаў дрэнная. Пасля першай і максімум другой сціркі нельга пазнаць, якога колеру тая ці іншая прадукцыя. У лютым віцебскае аддзяленне Саюзатрыкатажзбыта забракавала і перавяло ў ніжэйшыя гатункі 8.700 трыкатажных адзінак і 9.500 панчошных. За першы квартал фабрыка ўпляціла па рэкламацыі 100 тысяч рублёў.

На фабрыцы парушаюцца самым грубым чынам указанні партыі і ўрада аб папышэнні асартыменту прадукцыі. За студзень і люты недадана 25 тысяч дзесяткаў самых прыгожых, модных і больш танных мужчынскіх наскоў «Мулінэ». Зусім не прыступілі да выпрацоўкі жаночых панчох 15 артыкула (гэтыя панчохі вырабляюцца з грабянога прадзіва); па плану патрэбна было выпусціць 10 тысяч дзесяткаў.

Такое-ж становішча па трыкатажных вырабах. Белая бялізна, майкі і футболкі (белыя) зусім не выпускаліся. Фабрычныя арганізацыі ўзялі курс на выкананне агульнай колькасці вырабаў, ігнаруючы той асартымент, які патрэбен спажыўцу.

Перавыдатак сыравіны, нізкая якасць, ухіленне ад асартыменту, — усё гэта прывяло да павышэння сабекошту прадукцыі. У студзені фактычнае зніжэнне сабекошту складала ўсяго 0,8 проц. У лютым — 1,64, замест планавых 8 проц.

У лістападзе 1935 г. многія работніцы перайшлі на абслугоўванне павялічанай колькасці машын. Яны выконвалі свае нормы, давалі добрую якасць прадукцыі. За апошні час наглядаецца перавод стаханавак зноў на старыя метады работы.

Стаханаўка тав. **Краўчанка Браніслава** абслугоўвала тры вязальныя машыны. За абслугоўванне двух машын ёй аплочвалі па выпрацоўцы, а за трэцюю машыну яна на працягу некалькіх месяцаў не атрымала ні капейкі, не гледзячы на тое, што на ўсіх трох машынах тав. Краўчанка выконвала норму.

— На мае патрабаванні адрамантаваць машыны, — скардзіцца Краўчанка, — ніхто не звярнуў увагі. Гэта мяне прымусіла перайсці на работу «па-старынцы». Стаханаўка вязальнага цэха тав. Шандарэнка абслугоўвае 24 машыны 17 класа; раней яна працавала на 12 машынах. І вось за абслугоўванне старых 12 машын ёй аплочваюць поўнасцю, а за дадатковыя 12—толькі 50 проц. Гэта ў той час, як Шандарэнка на ўсіх 24 машынах выконвае сваю норму і дае добрую якасць.

У швэйна-бялізнай цэху вялікія прастоі з-за няспраўнасці машын (апараты для асноў негодныя, дрэнна сшыты рамні, тармазы не працуюць). З 15 па 29 сакавіка на двух канвеерах зменны «Л» швэйна-бялізнага цэха машыны прастаялі 22 гадзіны. 7 машын прастаялі 11 гадзін з-за таго, што рабочым з-за нераспарадчасці адміністрацыі не было своечасова падана прадзіва, хоць недахвату прадзіва на фабрыцы не было.

Вядомая стаханаўка фабрыкі, член ЦВК БССР **Елена Норкіна**, скардзіцца на тое, што вязальны цэх падае швэйна-пецельнаму цэху панчохі то грубыя, то зусім тонкія з абрывышкамі. Гэта прыводзіць да пагаршэння прадукцыйнасці працы і да пагаршэння якасці прадукцыі. Пры надзяванні вельмі тонкіх панчох на токелі атрымліваюцца частыя праразы.

Усё гэта гаворыць аб тым, што кіраўніцтва фабрыкі «КІМ» (намеснік дырэктара **Мазья**, старшыня фабкома **Сатчука**, сакратар парткома **Крыжулін**) яўна ігнаруе рашэнні снежаньскага пленума ЦК ВКП(б) аб разгортванні стаханаўскага руху ў лёгкай прамысловасці. Пры папушэнні кіраўнікоў сабатажнікі адкрыта зрываюць стаханаўскі рух.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

ТРОХТЫСЯЧНІКІ

Стаханаўскі рух шырока ахапіў усе галіны народнай гаспадаркі СССР, у тым ліку соўгасы і калгасы. Прыём у Крамлі Марыі Дземчэнка з яе падругамі пяцісотніцамі, прыём перадавікоў ураджайнасці па зярну, ільну і жывёлагадоўлі кіраўнікамі партыі і ўрада СССР і асабісты тавары-шом **Сталіным** выклікаў сярод масы калгаснікаў і рабочых соўгасаў велізарны працоўны энтузіязм і творчую ініцыятыву ў барацьбе за высокія ўраджаі.

У калгасах пачалі арганізоўвацца стаханаўскія звенні, якія паставілі перад сабой задачу атрымаць у 1936 годзе рэкордныя ўраджаі.

Першым у БССР узяўся атрымаць рэкордны ўраджай бульбы — 3 тысячы пудоў з гектара — звеннявы калгаса «Чырвоны баец», Барысаўскага раёна, тав. **Ганчарэвіч Аляксей Сцяпанавіч.** Амаль адначасова з ім такія-ж абавязацельствы ўзяло на сябе звяно тав **Шэршня Мацвея Карпавіча** з калгаса **«Большэвік»**, таго-ж раёна.

Атрымаць тры тысячы пудоў бульбы з гектара справа зусім рэальная. Але для гэтага трэба пакласці многа энергіі і штодзённых клопатаў аб кожнай расліне, кожным клубні.

У 1935 годзе па БССР мы мелі ў сярэднім ураджай бульбы ў размеры 675 пудоў з гектара. Рад перадавых калгасаў з пасобных участкаў атрымалі ад 1.500 да 2.000 пудоў. Атрымаць 3.000 пудоў бульбы з гектара гэта значыць атрымаць ураджай больш чым у чатыры разы за сярэдні ўраджай бульбы па БССР у 1935 годзе. Падкрэсліваем — задача гэта зусім рэальная.

Барысаўскае раённае партыйнае і совецкае кіраўніцтва аднеслася да гэтай справы з выключнай увагай. Асабліва гэта датычыць сакратара райкома партыі тав. **Майсеева**, які хутка падхапіў ініцыятыву калгасаў.

Дзякуючы вялікай арганізацыйнай рабоце, праробленай раённым кіраўніцтвам і газетай «Большэвік Барысаўшчыны», мы маем зараз у Барысаўскім раёне 30 калгасаў, якія ўзяліся атрымаць у 1936 годзе 3.000 пудоў бульбы з гектара.

Гэты рух у Барысаўшчыне прымае масавы характар. 24 снежня 1935 г. на нарадзе пры райкоме партыі, прысвечанай гэтаму пытанню, прысутнічалі прадстаўнікі толькі двух калгасаў. Затое праз тры месяцы на такой-жа нарадзе прысутнічала ўжо 60 чалавек ад 30 калгасаў.

Вытворчая нарада 30 перадавых калгасаў, скліканая райкомам і райвыканкомам 30 сакавіка, была прысвечана генеральнай праверцы гатоўнасці да сяўбы, барацьбе за 3.000 пудоў бульбы. Нарада паказала, што калгаснікі-трохтысячнікі сапраўды правялі вялікую падрыхтоўчую работу. Напрыклад, звяно тав. Ганчарэвіча, з калгаса «Чырвоны баец», зрабіла наступнае: падрыхтавала 21 тысячу пудоў гною, 2.100 пудоў торфу, 402 пуды попелу, 640 пудоў бульбы закладзена на яравізацыю, зроблены два маркеры, за звяном замацаваны коні, сельскагаспадарчы інвентар, падрыхтаваны ўчасткі. У звяне вядзецца сістэматычная агравучоба. За зіму праведзена 40 заняткаў.

Звяно тав. **Шэршня** з калгаса «Большэвік» падрыхтавала 220 вазоў гною, 261 воз торфу, 60 пудоў попелу, падрыхтаваны маркеры, выбраны ўчасткі, расстаўлены людзі.

Звяном тав. **Савіч**, з калгаса «Новае жыццё», падрыхтавана 18.000 пудоў гною, 24.000 пудоў торфу, 90 пудоў попелу, 12 пудоў курынага памёту. На яравізацыю бульба яшчэ не пакладзена, маркеры не зроблены.

Звяном тав. **Сакун**, з калгаса «Камінтэрн», падрыхтавана 18.000 пудоў гною, 600 пудоў торфу, 48 пудоў попелу, 30 пудоў курынага памёту, закладзена на яравізацыю 300 пудоў бульбы, выбраны ўчасткі, расстаўлены людзі.

24 сакавіка гэтага года ў калгасах «Большэвік» і «Чырвоны баец» мы правялі праверку гатоўнасці да сяўбы і падрыхтаванасці да барацьбы за 3.000 пудоў бульбы. Агульным недахопам у гэтых калгасах з'яўляецца тое, што разам з вялікай работай па падрыхтоўцы ўгнаення не было звернута належнай увагі на падрыхтоўку насеннага матэрыялу бульбы. У выніку ў абодвух калгасах частка бульбы аказалася загніўшай, якую неабходна было перабраць, прасушыць і т. д. Да недахопаў трэба аднесці яшчэ адсутнасць аднагатунковага матэрыялу бульбы. Гэтыя недахопы зараз у Барысаўскім раёне ўжо знішчаюцца.

Асаблівасцю масавага руху за 3.000 пудоў бульбы з гектара ў Барысаўскім раёне з'яўляецца тое, што калгасы ставяць сваёй мэтай не толькі атрымаць 3.000 пудоў бульбы з гектара на ўчастках ад 3 да 15 гектараў, але атрымаць не менш 1.500 пудоў з гектара ў сярэднім па калгасу. Разам з тым у гэтых калгасах вядзецца барацьба за высокі ўраджай зернавых культур. Напрыклад, калгас «Чырвоны баец» абавязаўся атрымаць з асобных участкаў 180 пудоў зернавых з гектара.

Інстытут біялогіі БелАН ужо грунтоўна звязаўся з калгасамі Барысаўскага раёна. Уся работа па фітапаталогіі будзе праводзіцца ў калгасах Барысаўскага раёна.

Зараз мы ўступаем у перыяд сяўбы. Кожны прапушчаны дзень з правядзеннем устаноўленых агратэхнічных мерапрыемстваў будзе ствараць труднасці ў барацьбе за 3.000 пудоў бульбы з гектара і наогул высокіх ураджаяў.

Зараз, калі калгасы знаходзяцца ў перыядзе сяўбы, калі большасць калгасаў Барысаўскага раёна падрыхтавалі ўжо гной, сельскагаспадарчы інвентар, участкі, неабходна звярнуць галоўную ўвагу на наступнае.

Там, дзе не праведзена адборка пасадачнага матэрыялу, неабходна адабраць яго дасканалым чынам, так, каб ні адзін хворы клубень — кароставы, механічна пашкоджаны не быў пасаджан у зямлю. Прычым, матэрыял павінен быць аднагатунковым. Гатунак для атрымання рэкордных ураджаяў павінен быць позні або сярэднеспелы — «Вольтман», «Сылезія», «Кругер», «Юбель», «Парнасія», «Свіцязь».

Калі яравізацыя не зроблена, увесь пасадачны матэрыял павінен быць дасканала прасушаны. На яравізацыю павінна быць абавязкова пакладзена бульба для пасадкі—на той выпадак, калі некаторыя клубні не ўзыйдуць. Бульбу, якая падвергалася моцнаму гніенню ў час зімовага хавання, не патрэбна садзіць.

Пасадачны матэрыял павінен быць з клубняў вагой ад 50 да 70 грамаў, ва ўсякім разе не менш.

У кожным калгасе трэба падрыхтаваць сродкі барацьбы з хваробамі, у прыватнасці супроць фітафторы, як прэпарат «АБ», медны купарос, апылкавальнікі, і апырскавальнікі. Гэта мерапрыемства ў барацьбе за 3.000 пудоў бульбы мае буйнейшае значэнне ва ўмовах БССР.

Тэхнічнае кіраўніцтва праведзеннем гэтага мерапрыемства бярэ на сябе інстытут біялогіі.

За звяном павінны быць замацаваны на ўвесь час пэўныя людзі, сельскагаспадарчы інвентар і коні. Трэба памятаць, што атрымаць высокі, устойлівы ўраджай можна толькі пры ўмове, калі будзе праведзен комплекс агратэхнічных мерапрыемстваў. Нельга чакаць добрых ураджаяў ад унясення толькі аднаго гною, калі не будзе добрага ўраджайнага гатунку, калі не будзе належнага догляду за бульбай на працягу ўсяго часу.

Масавы рух у Барысаўскім раёне за 3.000 пудоў бульбы з гектара, ініцыятыва Барысаўшчыны павінны быць падхоплены ўсімі раёнамі БССР. Трэба адзначыць, што ў некаторых раёнах гэта вельмі важнае мерапрыемства не знайшло яшчэ да гэтага часу належнага падтрымання, на сутнасці, пустчана на самацёк. Да такіх раёнаў у першую чаргу трэба аднесці Бабруйскі раён, Чырвонапольскі, Церахаўскі і нават Менскі.

Мы ўпэўнены, што ўзятае абавязацельства — атрымаць 3.000 пудоў бульбы з гектара будзе выканана, але для гэтага неабходна, не чакаючы ні адной мінуты, узяцца па-большэвіцку за работу.

Прафесар Н. ДАРОЖКІН.

ВЫХОДНЫ ДЗЕНЬ СТАЛІЦЫ БССР

ЛЕКЦЫІ, ГУРТКІ, КАНЦЭРТЫ

У цэнтральным доме тэхнікі каля 200 стаханаўцаў—слухачоў універсітэта выходнага дня з вялізарнай увагай праслухалі лекцыі тав. Прында на тэму—«Планы германскай агрэсіі і становішча ў Еўропе» і акадэміка Замоціна на тэму — «Жыццё і творчасць вялікага рускага паэта А. С. Пушкіна». Артысты беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета далі для стаханаўцаў канцэрт з твораў вялікага паэта. Яны выканалі арыі з опер «Пікавая дама», «Яўгені Анегін» і інш.

У клубе завода імя Мяснікова з раніцы займаліся гурткі заходніх танцаў, кройкі і шыцця. Вечарам у клубе ішла кінохроніка «Вражыя тропы».

Выключна цікава прайшоў выходны дзень у рабочых будаўнікоў. Увесь дзень у клубе быў адкрыт пакой адпачынку, які наведалі 120 чалавек. Да іх паслуг быў більярд, шахматы, газеты і т. д. Днём займаліся два гурткі танцаў. Вечарам на кватэру стаханаўца-штукатура тав. Клапера сабраліся 30 лепшых стаханаўцаў—будаўнікоў горада. Яны праслухалі антырэлігійны даклад праф. Брантштэйна. Артысты яўрэйскага Дзяржаўнага тэатра далі канцэрт. У клубе 200 будаўнікоў слухалі лекцыю тав. Ашаровіча на тэму — «Рэлігія і фашызм».

У клубе медсанпраны адбыўся шахматны турнір.

У ЮНЫХ ТЭХНІКАЎ

На дзіцячай тэхнічнай станцыі юныя натуралісты вывешвалі птушкоўніцы, юныя аэатэхнікі рабілі запісы росту трусоў, качак і куранят. Вучань 21 школы Кузняцоў прыехаў з сваім бацькам — рабочым завода імя Мяснікова. Ён зрабіў яму ў падарунак фотаапарат.

У авіямадэльнай лабараторыі таксама кіпела работа. Вучань 5 школы Лундзін рабіў мадэль самалёта, вучань 4 школы Сталяроў—мадэль планера. Юныя авіямадэлісты Радзівонаў, Дзьяканенка і Умецкі пачалі працаваць над мадэллю дырыжабля сваёй канструкцыі, кіруемага па радыё.

У 2 гадзіны адбылася цікавая гутарка. Юны тэхнік Іодэс, які вярнуўся з Масквы, расказаў дзецям, якія ён бачыў падарункі, прысланыя з усіх рэспублік і абласцей Савецкага Саюза X з'езду комсамола.

ВЯСНА

На Чорнаморскім узбярэжжы наступілі цёплыя веснавыя дні. У Сочынскім дэндрарыі Наркомлеса цвітуць яйва, мімоза, камелія, магнолія.

НА ЗДЫМКУ: вучаніца 9 класа 1 школы Тося Акімава аглядае цвітучыя дрэвы ў Сочынскім дэндрарыі.

Фота Хельмер (Саюзфота).

ТЫРАЖЫ МАСАВЫХ ПАЗЫК У ДРУГІМ КВАРТАЛЕ

У другім квартале адбудзецца восем тыражоў выйгрышаў па масавых пазыках.

10—12 красавіка ў г. Кіраве будзе праведзены 14-ты тыраж «Пазыкі чацвертага, завяршальнага года пяцігодкі» і 51-шы тыраж «Пазыкі трэцяга, рашаючага года пяцігодкі».

10—12 мая на маскоўскім электрамбінаце імя Куйбышава праводзіцца 52 тыраж «Пазыкі трэцяга, рашаючага» і 23—28 мая ў Варонежы—22 тыраж пазыкі «Пяцігодка за чатыры гады» і «Трэцяй пазыкі індустрыялізацыі».

У чэрвені будзе праведзена 4 тыражы: 1—4 чэрвеня ў Смаленску адначасова праводзяцца адзі. нацыаты тыраж выпуску першага года, сёмы тыраж выпуску другога года і першы і другі тыражы выпуску трэцяга года пазыкі другой пяцігодкі.

53-ці тыраж «Пазыкі трэцяга, рашаючага» адбудзецца 10—12 чэрвеня ў г. Саранску.

МЕНСК—ТІФЛІС

Учора супрацоўнік «Звязды» звязаўся па тэлефону з рэдакцыяй газеты «Заря Востока» ў Тыфлісе. Сакратар рэдакцыі тав. Новікаў паведаміў апошнія навіны па Закаўказзю.

— На батумскіх нафтаперагонных заводах закончыўся стаханаўскі двухдзекадник. Заводы далі звыш плана 3.286 тон бензіну. План па газе выканан на 128 проц.

— Па Закаўказзю ідзе ачыстка зернавых. Разгарнулася падрыхтоўка да пасеву табаку.

— У Камарлінскім раёне (Арменія) адкрыўся кінофестываль для калгаснай моладзі.

— Тыфліская дзіцячая чыгунка гатэмі днямі пачала сваю работу.

— У выходны дзень у Тыфлісе адбыўся футбольны матч паміж камандамі Тыфліса і Харкава. Матч скончыўся з рахункам 2:1 на карысць Тыфліса.

З Масквы, Ленінграда, Днепрапятроўска і іншых гарадоў Саюза ў Тыфліс прыбылі да 150 спартсменаў на веснавую трэніроўку.

— У Цхалтубо пачаўся курортны сезон. У Новым Афоне сезон адкрыецца 1 мая.

— Учора ў Тыфлісе было дзіўнае надвор'е. Цёпла. Цвітуць фруктовыя дрэвы.

НОЧЧУ З ВЫКЛЮЧАНЫМІ ФАРАМІ

(Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»)

Вадзіцелі робяць апошні агляд. На месца старту — пляц Волі ў Менску прыходзіць загадчык прамыслова-транспартнага аддзела ЦК КП(б)Б тав. Готфрыд. Яго акружаюць удзельнікі аўтапрабегу. Тав. Готфрыд гутарыць з шоферамі-стаханаўцамі, дае ім парады, гаворыць аб значэнні аўтапрабегу.

Гарадскі гадзіннік б'е 12. Камандор прабегу тав. Фрыдман выпускае чырвоную ракету.

— На машынах!

Загудзелі маторы. Першай са старту зрываецца машына камандора, за ёю накіроўваецца ўся калона. Фары патушаны — такія ўмовы начнога вае нізаванага аўтапрабегу Менск — Магілеў, — Менск, прысвечанага X з'езду ВЛКСМ.

Выязджаем на Магілеўскую шашу. Каля аркі астаноўка. Камандор апошні раз правярае машыны. Яшчэ раз узвіваецца ракета. «Шчаслівай дарогі!» — пасылаюць нам уздагон праважаючыя.

Ідзе снег. Туманна. Але за рулямі стаханаўцы і яны таксама ўпэўнена вядуць машыну, як і ўдзень. Паступова праясняецца. Выглянуў месяц і нібы велізарнай фарай асвяціў шашу.

Хуткасць расце: 30... 40... 50 кілометраў у гадзіну. Ракета дае сігнал аб павелічэнні хуткасці. Лепшы стаханавец прабегу, комсамолец-вадзіцель тав. Давідсон рапортам выводзіць сваю машыну з калоны. У яго «спусціла» кола. Давідсон паведамляе пра гэта камандору і хутка ставіць запасное.

Пройдзена 110 кілометраў — палова шляху. Калона спыняецца. З удзельнікамі прабегу праводзіцца фізкультурная зарадка. У Магілеў прыязджаем у 5 гадзін 35 мінут 6 красавіка. Разлічана было прыбыць у 6 гадзін.

Пасля снедання доктар Шэйнюк — загадчык цэнтральнага габінета фізкультуры — робіць даследванне стомленасці вадзіцеляў. Менш за ўсіх стаміліся вадзіцелі, якім спрыснулі пантакрын (вышыжкі з аленніх пантаў (рагоў).

Вечарам на гарадскім пляцы ўрачыстае спатканне з прапоўнымі Магілева. Пасля абеда ідзем у тэатр, а з тэатра — да машын. Зноў выязджаем, роўна ў 12 гадзін ночы. Машыны ідуць з уключанымі фарамі, але ўдзельнікі прабегу — у супрацьгазах. На гэты раз менш астановак. У 5 гадзін 30 мінут 7 красавіка калона фінішыруе ў Менску.

Прабег скончаны. Вынікі нядрэнныя. Эканомлена многа гаруча-га, асабліва выдатны паказальнік у комсамольца Давідсона. На 1 кілометр шляху ў яго пашло 74 грамы гаручага, пры норме ў 100 грамаў. 79 грамаў траціла на адзін кілометр стаханаўка вадзіцельніца Ніна Гутнік. Выдатна правялі прабег шоферы Марсон, Паўлоўскі і Станілевіч.

І. ЦЫВЕС.

КАНФЕРЭНЦЫЯ ЧЫТАЧОЎ «ДРЫГВЫ» Ў ЛЕЗНЕ

ЛЕЗНА, 7 красавіка. (Кар. «Звязды»). Сёння ў лёзнянскім кінотэатры адкрылася раённая канферэнцыя калгаснікаў — чытачоў «Дрыгвы» Якуба Коласа. На канферэнцыі прысутнічае каля 600 чал. З дакладам аб творчасці Коласа выступіў дырэктар мясцовай узорнай беларускай школы тав. Уголеў.

У канферэнцыі прымаюць удзел аўтар «Дрыгвы» народны паэт рэспублікі Якуб Колас і пісьменнік Крапіва.

ДОМ МАСТАЦКАГА ВЫХАВАННЯ ДЗЯЦЕЙ У БАБРУЙСКУ

БАБРУЙСК, 7 красавіка. («Кар. «Звязды»). 5 красавіка ў Бабруйску адкрыўся дом мастацкага выхавання дзяцей.

Атрыманы прывітальныя тэлеграмы ад старшыні ЦВК БССР тав. Чарвякова, старшыні СНК БССР тав. Галадзеда і намесніка старшыні СНК тав. Саакяна.

У рабоце гуртковага Дома прымаюць удзел да 400 дзяцей: 17 займаюцца ў духавым аркестры, 24— у сімфанічным, 70 — у харавым гуртку, 80 — у драматычным, 23— у балетнай групе і т. д.

ШЛЮПАЧНЫ ПЕРАХОД ПА РЭКАХ ПАЛЕССЯ

МАЗЫР, 7 красавіка. (Кар. «Звязды»). 6 красавіка ў Мазыры дан старт шлюпачнаму пераходу гомельскіх і мазырскіх асвадаўцаў па маршруту Мазыр — Любань — Мазыр па рэках Прыпяць, Пціч і Арэса ўверх па пячанню вады. Пераход разлічан на 10 ходавых дзён у адзін бок на адлегласці 200 кілометраў. Мэта пераходу — дапамагчы рэчнаму транспарту ў асваенні для эксплаатацыі ракі Арэсы, якая пячэ па глухіх мясцах Палесся.

Коратка

(Ад карэспандэнтаў «Звязды» і Белта).

* Усебеларуская нарада па пчалярству адбылася ў г. Клімавічах. Клімавіцкі сельскагаспадарчы тэхнікум выпусціў для работы ў раёнах 36 заатэхнікаў-пчаляроў.

* Канферэнцыя актыва менскага аэраклуба імя Молакава адбылася 5 красавіка. Начальнік аэраклуба тав. Клімаў зрабіў даклад аб выніках работы аэраклуба за 1935 г. і аб задачах на 1936 г.

НЕКРАЛОГ

В. М. СТРУСЕВІЧ

Памёр дырэктар 4-й менскай сярэдняй школы тав. Струсевіч, які 25 год бяззменна прапрацаваў у гэтай школе. Настаўніцтва і савецкая грамадскасць сталіцы ордэнаноснай БССР ведалі тав. Струсевіча, як выдатнага арганізатара, таленавітага педагога, любячага і ведаючага сваю справу.

На тав. Струсевіча быў усладзен ганаровы абавязак камуністычнага выхавання многіх сотень нашай савецкай дзетвары. Ён з гонарам выконваў гэтыя абавязкі. Ведучы актыўную барацьбу за рэалізацыю рашэнняў партыі і ўрада аб школе, тав. Струсевіч здолеў вывесці сваю школу на адно з першых месц у БССР.

Тав. Струсевіч выкладаў у школе геаграфію. Добра ўладаючы гэтым прадметам, ён умеў надзвычай цікава, выкарыстоўваючы вялікі дыдактычны матэрыял і ў той-жа час даваў вучням сапраўдныя навуковыя веды, без якіх немагчыма комуністычнае выхаванне.

Будучы патрабавальным да другіх, ён быў перш за ўсё патрабавальным да самога сябе. Ніколі не дазваляў ён сабе прыходзіцца на ўрок не падрыхтаваўшыся і кожную мінуту ўрока выкарыстоўваў з максімальнай эфектыўнасцю.

Таму ён карыстаўся вялікім аўтарытэтам сярод сваіх вучняў і педагогаў.

Сотні выхаванцаў тав. Струсевіча, настаўніцтва і грамадскасць горада Менска захаваюць аб ім светлую памяць як аб сапраўдным савецкім народным настаўніку.

ГЕРШОН. КУЗНЯЦОВА, ХЕЙФЕЦ, ЕРАФЕЕЎ, БАШКЕВІЧ, ВАСІЛЬЕВА, ШЫНКЕВІЧ, КАЛІНІЧЭНКА.

ЗАБЕСПЯЧЭННЕ СЯМ'І ПАМЕРШАГА ТАВ. СТРУСЕВІЧА

У сувязі са смерцю дырэктара 4-й менскай сярэдняй школы тав. В. М. Струсевіча, Народны камісарыят асветы БССР пастанавіў: выдаць жонцы тав. Струсевіча Елене Сямёнаўне аднаразовую дапамогу ў размеры 500 рублёў, дачку Іру, вучаніцу 7 класа—забяспечваць усімі школьнымі прыладамі за кошт Наркомасветы, сына Юрыя змясціць на дзяржаўны кошт у дзіцячы сад.

ПЕРАХОД КІЕЎ—МЕНСК—ЛЕНІНГРАД У СУПРОЦЬГАЗАХ

Учора ў Менск прыбыла з Кіева каманда работнікаў цэнтральных дзяржаўных устаноў УССР, якая робіць пераход у супрацьгазах па маршруту Кіеў—Менск—Ленінград працягласцю 1.600 кілометраў. У складзе каманды 9 чал. Начальнік пераходу — работнік супрацьпаветранай і хімічнай абароны кіеўскага аблмясцпрома тав. Рудзянка, палітрук — інструктар ЦВК УССР тав. Вязоўскі.

З Кіева каманда вышла 21 сакавіка і шлях да Менска (680 кілометраў) зрабіла за 15 ходавых дзён. У Менску ўдзельнікаў пераходу сустракалі асоавіяхімаўцы рэспубліканскіх і гарадскіх дзяржаўных устаноў і студэнты. У сталіцы БССР каманда прабудзе два дні і азнаёміцца з пастаноўкай абарончай работы ў дзяржаўных установах.

ЗДАРЭНКІ

* Прыклад свядомасці. У 3-е гарадское аддзяленне міліцыі г. Менска з'явілася гр-ка А. І. Чыстоўская, якая прыязджае па вуліцы Розы Люксембург, і прынесла знойдзены ёю кашалёк, у якім знаходзіліся дакументы і 50 руб. Кашалёк належыць рабочаму завода «Ударнік» Д. Я. Рачэўскаму.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Варашылаўскі горайком КП(б)Б г. Менска паведамляе, што ніжэй пераймяванаваныя згубленыя і ўкрадзеныя партбілеты і кандыдацкія карткі лічыць несапраўднымі:

Кульбан Антаніна Саламонаўна, партстаж з 1928 г., партбілет № 1108604; Ракавец Лука Іванавіч, партстаж з 1932 г., партбілет № 0405218; Эрэнбург Соф'я Іосіфаўна, партстаж з 1922 г., партбілет № 0805782; Кац Геня Ісаакаўна, партстаж з 1931 г., кандыдацкая картка № 68576; Вішнеўскі Канстанцін Іванавіч, партстаж з 1932 г., кандыдацкая картка № 2061; Аўраменка Лукер'я Пракоф'еўна, партстаж з 1932 г., партбілет № 74382; Алейнікаў Уладзімір Леанавіч, партстаж з 1932 г., партбілет № 68382; Цэхановіч Нікалай Уладзіміравіч, партстаж з 1933 г., партбілет № 96423.

8 красавіка 1936 года, у 9 гадзін вечара, у памяшканні Дома партактыва (вялікая зала) адбудзецца нарада сакратароў і парторгаў Сталінскага раёна.

СТАЛІНСКІ РК КП(б)Б.

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.

Першы Беларускі дзяржаўны тэатр БДТ-1
8 красавіка
ПЛАТОН КРЭЧЭТ
Пачатак у 8 г. веч. Білеты ў касе тэатра

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка»
Гукавы мастацкі фільм
„Мы з Краштата"

Гукавы кінотэатр «ПРОЛЕТАРЫЙ»
Новы гукавы фільм
ЧАЛАВЕК І МАЛПА

Гукавы кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»
Гукавы мастацкі фільм
„ПРЫВАТНАЕ ЖЫЦЦЁ ПЕТРА ВІНАГРАДАВА"

Кіно «СПАРТАК»
Ад 7 красавіка
вядомы выдатны фільм
„БЛАКІТНЫ ЭКСПРЭС"
Драма ў 6 частках.
У праграме кінахроніка.
Штодзенна 4 сеансы.
Каса з 4 гадзін дня.

Патрэбен пакой інжынеру з жонкай, кухняй не карыстаемся, аплата па згодзе. Дом урада, 8 паверх, пакой 807, гвадзіству з 2 да 3 з палов. гадзін, тэл. 23-231.

ЦЭНТРАЛЬНЫ ДОМ ТЭХНІКІ (КОМСАМОЛЬСКАЯ, 25).
9 красавіка ДАКЛАД начальніка сектара мясцовых відаў апал у Дзяржплана СССР тав КАРЭЛІНА
на тэму «КРУГЛАГАДОВАЯ ЗДАБЫЧА ТОРФУ ПА СПОСАБУ інжынера КАРЭЛІНА».
Запрашаюцца навуковыя работнікі, энергетыкі, тарфянікі, цеплатэхнікі і гаспадарнікі.
Пачатак роўна ў 8 гадзін вечара.

БЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА
„САЮЗКАНСЕРВЗБЫТ"
мае вялікі асартымент кансерваў:
гароднінныя, зялёны гарошак, цукровая кукуруза, рыбныя, мяса-раслінныя, мясныя і інш.
Розныя высокакласныя паўднёвыя гатункі варэння:
вішнёвае, кісель, персікі, абрыкосавае, малінавае, алыч, яблычнае, грушавае, джэмы, айва.

перац, баклажаны, зялёны гарошак, кукуруза, кефаль, скумбрыя, бычкі, асетрына і бялуга.
Тамат-паста (шчыльнасць 30 проц.), халва, рахат-лукум і глазіраваныя фрукты.
ПАТРАБУЙЦЕ нашу прадукцыю ва ўсіх прадуктовых магазінах.
Адрас: Менск, Маскоўская, 8-1, тэл. 21-122, Белкантора «Саюзкансервзбыт».

Сёння, 8 красавіка, у 7 гадзін вечара, у канферэнцзале БелАН
аспірант-дактарант Інстытута хіміі БелАН Бабраўніцкі Уладзімір Сцяпанавіч
публічна абараняе ДЫСЕРТАЦЫЮ
на ступень кандыдата хімічных навук.
Тэма дысертацыі «Каталітычная кандэнсацыя ацэтылена з хлоранілінамі».
Афіцыяльны апанент праф. Б. М. Шпенцер.
Дырэкцыя Інстытута хіміі БелАН

ДАЎВАГІ
савецкіх і кааператыўных арганізацый, навуковых інстытутаў, лабараторый, школ, лячэбных устаноў, саўгасаў, калгасаў, МТС і ЖАКТАЎ.
У бліжэйшыя дні АДКРЫВАЕЦЦА ў Менску, па Савецкай вуліцы, рог Энгельса 85/24
СПЕЦЫЯЛЬНЫ МАГАЗІН ХІМІЧНЫХ ТАВАРАЎ
„САЮЗХІМСНАБЗБЫТ"
Магазін будзе мець заўсёды ў продажы:
Кіслоты: серная, саляная, азотная, воцатная і борная.
Шчолачы: едкі калій, едкі натр, пішчевая сода, шчолак для сціркі бялізны, хлорная вапна.
Солі: бура, нашатыр, квасцы, медзяны купарос, жалезны купарос і хромавыя солі.
РЭАКТЫВЫ І ФОТАХІМІКАТЫ
Мінеральныя ўгнаенні—для сельскай гаспадаркі і індывідуальных рабочых агародаў.
Сумесі для ўгнаення: — для любіцельскага садоўніцтва, агародніцтва і цветаводства для паляпшэння росту і павелічэння ўраджайнасці раслін.
ЯДЫ: для барацьбы з садовымі і агароднымі шкоднікамі.
АНІЛОКРАСІЛЬНІКІ — вышэйшай якасці для афарбоўкі тканак шарсцяных, шаўковых і баваўняна-папяровых.
ЛАКАФАРБЫ — нафталін, жалацін.
БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ САЮЗХІМСНАБЗБЫТА.

ПАСТАНОВА
МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА ФІНАНСАВАГА АДДЗЕЛА ад 5 красавіка 1936 г.
Разгледзеўшы матэрыялы праверкі правільнасці ўтрымання падаходнага падатку і культзбору з зарплаты рабочых і служачых па аўтагужпарку Менхарчгандля, буфета-рэстарана станцыі Менск, эксплаатацыйнай часткі Аўтарэмстанцыі, вага-рамонтнай базе Белметалатрэста, Белта, Менскурпрамсаюза, Бел. аддзялення соўгасснабжэння, Белзаготплодгародніне (рознічны сектар), кіно «Інтэрнацыянал», аддзелу снабжэння Белбудтрэста, пабудове гаража СНК, рэзінаабыту, першай дзіцячай кансультацыі, сектару снабжэння Белдрэва, Белкаапрамсавету, абменнаму пункту зах чыг., Металпрамсаюзу, гарадскі фінансавы аддзел адзначае, што ў выніку адсутнасці кіраўніцтва з боку галоўных бухгалтароў і нядбайных адносін да сваіх абавязкаў рахунковых работнікаў, непасрэдна звязаных з гэтай справай, і дапушчэння да работы, звязанай з утрыманнем падаходнага падатку і культзбору з рабочых і служачых, работнікаў, не прайшоўшых семінары гарфа, дапушчан рад парушэнняў пастановы ЦВК і СНК Саюза ССР ад 14 студзеня 1935 г. аб падаходным падатку і культзбору 1935 г.
Выходзячы з гэтага і кіруючыся арт. 36 палажэння аб падаходным падатку, менскі гарадскі фінансавы аддзел ПАСТАНАЎЛЯЕ:
1. За непрадастаўленне ільгот па шматсямейнасці, аблік і нясвоечасовы перавод грошай па падаходнаму падатку і культзбору, ўтрыманым з зарплаты рабочых і служачых, накіраваць гарпракурору матэрыял для прыцягнення да судовай адказнасці бухгалтара аўтагужпарка Менхарчгандля т. Міраненка.
2. За дапушчэнне няправільнасці пры ўтрыманні падаходнага падатку і культзбору з зарплаты рабочых і служачых накласці штраф на бухгалтароў наступных прадпрыемстваў і ўстаноў:
Эксплаатацыйнай часткі аўтарэмстанцыі т. Фліта, вага-рамонтнай базы Белметалатрэста т. Альперовіча і буфета-рэстарана станцыі Менск т. Салавейчыка ПА 75 РУБ. КОЖНАГА.
Белта — т. Каплінскага, Менскурпрамсаюз — т. Міньковa, Бел. аддзяленне соўгасснабжэння — т. Хейфец. Белзаготплодгародніны (рознічны сектар) — т. Мазеля, кіно «Інтэрнацыянал» —т. Русак ПА 50 РУБ. КОЖНАГА.
Аддзел снабжэння Белбудтрэста т. Бабіцкую, пабудова гаража СНК — т. Кобермана, Рэзінаабыт — т. Кіркавіча, і дзіцячая кансультацыя — т. Хентаву, сектар снабжэння Белдрэва — тав. Смірнова і Металпрамсаюза т. Шнейдэр — ПА 25 РУБ. КОЖНАГА.
3. ПАПЯРЭДЗІЦЬ усіх кіраўнікоў і рахунковых работнікаў устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый г. Менска, што ў далейшым за дапушчэнне ўсякага роду скажэнняў пры ўтрыманні падаходнага падатку і культзбору да іх будуць прыняты адпаведныя меры спагнання.
4. Абавязаць памянёных асоб накладзены на іх штраф унесці ў 5-дзённы тэрмін у Дзяржбанк і паведамленне аб уплаце прадставіць у гарфа не пазней аднаднеўнага тэрміну з дня ўплаты.
Заг. Гарфа — ЗАЛЕСКІ.

Трест высшей парфюмерии „ЛЕНЖЕТ"
АСАРТЫМЕНТ ПАРФЮМЕРЫІ І ТУАЛЕТНАГА МЫЛА ЗНАЧНА ПАШЫРАН
◀ВЫПУШЧАН РАД НАВІНАК▶
РОЗА, ЭЛАДА КАЎКАЗСКАЯ РЫЎЕРА
Трест высшей парфюмерии „ЛЕНЖЕТ"

Гарадскі аддзел народнай асветы з вялікім жалем паведамляе аб заўчаснай смерці дырэктара 4-й школы імя Кірава
ВЛАДЗІМІРА МІХАЙЛАВІЧА
СТРУСЕВІЧА
і выказвае глыбокае спачуванне Елене Сямёнаўне, ірачцы і Юрыку з прычыны ўрaты мужа і бацькі.
ГАРАНА.

Камсамольская група, піянерарганізацыя і вучні 4-й школы імя Кірава з глыбокім жалем выказваюць спачуванне сям'і заўчаснa памёршага дарагога дырэктара школы
Владзіміра Міхайлавіча
СТРУСЕВІЧА

Цэнтральны камітэт саюза работнікаў пачатковай і сярэдняй школы БССР выказвае глыбокае спачуванне Елене Сямёнаўне, Ірыі Юрыку Струсевіч з прычыны заўчаснай смерці мужа і бацькі — дырэктара 4-й менскай сярэдняй школы
ВЛАДЗІМІРА МІХАЙЛАВІЧА
СТРУСЕВІЧА

НКА, ЦК саюза работнікаў пачатковай і сярэдняй школы, гарана і калектыў 4-й школы паведамляюць усіх настаўнікаў гор. Менска, што вынас цела
Владзіміра Міхайлавіча
СТРУСЕВІЧА,
дырэктара 4-й школы, адбудзецца 8 красавіка, у 4 г. дня з дома працаседы (Комуністычная, 19).
Камісія па арганізацыі пахавання.

Секцыя народнай асветы Менгорсовета з глыбокім жалем паведамляе аб заўчаснай смерці дырэктара Менскай 4-й сярэдняй імя Кірава школы
СТРУСЕВІЧА
Владзіміра Міхайлавіча
і выказвае глыбокае спачуванне сям'і памёршага.
Бюро секцыі.

Калектыў 4-й школы імя Кірава з вялікім жалем паведамляе аб пяжкай утраце — заўчаснай смерці члена калектыва дырэктара школы дарагога
ВЛАДЗІМІРА МІХАЙЛАВІЧА
СТРУСЕВІЧА
і выказвае глыбокае спачуванне сям'і нябожчыка.

На падставе пастановы прэзідыума праўлення Белкаапсаюза за № 239 ад 15 сакавіка 1936 года,
МАГІЛЕЎСКАЯ МІЖРАЙБАЗА БЕЛКААПСАЮЗА
з 1 красавіка 1936 года
ЛІКВІДУЕЦЦА.
Усе арганізацыі і асобы, маючыя прэтэнзіі да магілеўскай міжрайбазы, павінны прад'явіць іх ліквідкому да 23 красавіка 1936 г.
Адрас ліквідкома: Магілеў, Першамайская вул., № 71.
Пасля ўказанага тэрміну, прэтэнзіі прымацца НЕ БУДУЦЬ.
ЛІКВІДКОМ.

Дырэкцыя, партком, мясцком, прафком, комсамольскі камітэт, калектыў работнікаў і студэнтаў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага інстытута выказваюць глыбокі жаль намесніку дырэктара па навучальнай частцы праф. АНІШЧАНКА ВАЛЕРЫЮ АРСЕНЬЕВІЧУ, з прычыны пасціг. шага яго бацькі — смерці брата
А. А. АНІШЧАНКА

Тыраж 90550 экз. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Савецкая, 63. Уп. Галоўлітбела № Г—4716